ЯК СЛУЖЫЦЦА ПЕРАМОЖЦУ «ФАКТАР.BY» 4





НОВАЯ ХВАЛЯ ЦІКАВАСЦІ ДА ПРЫШЭЛЬЦАЎ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ВЕРАСНЯ 2024 г. СУБОТА № 190 (30324)

З першых вуснаў

# «ХТО ПРАЦЯГНЕ БУДАВАЦЬ І РАЗВІВАЦЬ БЕЛАРУСЬ?»

## Адказы на якія пытанні шукае Прэзідэнт у сустрэчах са студэнтамі



Фота БелТА.

**Шчырыя і адкрытыя размовы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са студэнтамі беларускіх ВНУ працягваюцца. Грамадска-палітычныя і асабістыя пытанні з кіраўніком дзяржавы гэтым разам абмеркавалі студэнты ВНУ інжынерна-тэхнічнага профілю. «Адкрыты мікрафон з Прэзідэнтам» сабраў на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі неабыякавых студэнтаў, магістрантаў і выкладчыкаў з шасці ўніверсітэтаў, якія рыхтуюць людзей, адказных за тэхналагічны і навуковы суверэнітэт краіны. Першая падобная сустрэча прайшла ў пачатку верасня ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава. Тады кіраўнік дзяржавы адзначаў, што наспела тэма для сур'ёзнай размовы з пакаленнем, якому наканавана працягваць гістарычны шлях Беларусі.**

Наведванне ўніверсітэта Прэзідэнтам — гэта яшчэ і добрая нагода правесці міні-праверку таго, як тэхнічныя ВНУ рыхтуюць кадры, які ўклад робяць у рэальны сектар эканомікі. Спецыяльна для гэтага была прадстаўлена выстаўка навуковых і інавацыйных дасягненняў тэхнічных ВНУ Мінска. Яны датычацца такіх сфер, як стандартызацыя, паўышэнне абараназдольнасці, авіяцыя, транспарт і бяспека дарожнага руху. Медыцынскія і аграрныя тэхналогіі, сувязь. Рэктар БДУІР Вадзім Богуш расказаў, што ўніверсітэт працуе разам з абаронным сектарам эканомікі. Прэзідэнт пацікавіўся, ці могуць яны дапамагчы зрабіць высокадакладную і перашкодаўстойлівую ракету. Рэктар Вадзім Богуш далажыў: работы ў гэтым напрамку вядуцца. «Калі вы гэта зробіце, тады я буду лічыць, што вы не дарма хлеб ясце. Усё, што трэба, прасіце. Мы вам створым усе ўмовы. Але трэба зрабіць ракету перашкодаўстойлівую», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. ВНУ займаецца і беспілотным транспартам. Прэзідэнт яшчэ раз нагадаў, што адставаць у гэтай сферы нельга. Тэма надзвычай важная, як заўважыў кіраўнік дзяржавы ў аўторак, аглядаючы айчынныя мадэлі беспілотнікаў, сёння без іх ніякая вайна не магчыма. Таму градус увагі да беспілотнікаў зніжацца не будзе.

«БДУІР рыхтуе спецыялістаў і праводзіць навуковыя даследаванні па трох асноўных ключавых для краіны кірунках: мікраэлектроніка, радыёэлектроніка і сфера інфармацыйных тэхналогій. Мы працуем у цеснай звязцы з нашымі прадпрыемствамі. І ўступную кампанію гэтага года мы выканалі ў поўным аб'ёме, — расказаў рэктар БДУІР. — Пры гэтым мы пачалі падрыхтоўку па трох новых спецыяльнасцях: «Электроннае машынабудаванне» (мы яе робім разам з «Планарам» і «Інтэгралам»), «Кіберфізічныя сістэмы» і «Лічбавы маркетынг» (разам з прадпрыемствамі Міністэрства прамысловасці і ПВТ)». Вадзім Богуш таксама адзначыў, што асаблівая ўвага на ўніверсітэце ўдзяляецца практыка-арыентаванаму навучанню, каля 20 працэнтаў выкладчыкаў — эксперты з рэальнага сектара эканомікі.

СТАР. 2



КОРАТКА

**• 3 кастрычніка 2024 года Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергеенка правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Палаце прадстаўнікоў. Прыём праводзіцца па папярэднім запісе па тэлефоне (017) 222-69-25 — 30 верасня і 1 кастрычніка з 8.00 да 17.00.**

• У мінулым годзе ў Беларусі ва ўзросце 65 гадоў і старэйшым заключылі шлюбны саюз 592 жанчыны і 996 мужчын.

**• Прыгранічныя цягнікі паміж Беларуссю і Пскоўскай вобласцю з 28 верасня будуць хадзіць па суботах замест серады.**

ISSN 1990 — 763X

24190

Соцыум

# З ДУШОЙ І КЛОПАТАМ

## У Беларусі 1 кастрычніка адзначаць Дзень пажылых людзей



**У краіне жыве 1 мільён 574 тысячы (17 %) чалавек ва ўзросце 65 гадоў і старэйшыя. За апошнія дзесяць гадоў колькасць гэтай узроставай групы вырасла на 212 тысяч. Самым «сталым» з рэгіёнаў з'яўляецца Віцебская вобласць: тут жыве 19,4 % пажылых людзей, а самы малады — Мінск: грамадзян ва ўзросце 65+ тут усяго 16 %. Затое ў сталіцы самая вялікая колькасць доўгажыхароў — амаль сем тысяч чалавек перасягнулі 90-гадовы ўзрост, а 124 — стагадовы. Усяго ж у краіне больш за 40 тысяч чалавек ва ўзросце 90+ і 613 — 100 гадоў і больш. 85 % доўгажыхароў — жанчыны.**

СТАР. 7

Спажывец

# «Ешце вітаміны, пакуль яны танныя!»

## Наведалі галоўны сезонны кірмаш сталіцы: што і пачым купляем гэтай восенню?

**Восеньскія сельскагаспадарчыя кірмашы — магчымасць запасціся гароднінай-садавіной, свежым мёдам, салам і іншымі прысмакамі мясцовай вытворчасці максімальна танна. Нават тыя, хто прынцыпова не робіць нарыхтовак на зіму — не марынуе памідоры, не закручвае слоікі з кабачковай ікрой і ў любы іншы час аддае перавагу не зяляніне ў пучках, а парэзанай і вымытай, у фабрычным пакаванні — знаходзяць час пабываць на такіх пляцоўках. Таму што гэта ўжо традыцыя: якая ж гарадская восень без сельскагаспадарчых кірмашоў? Схадзілі на кірмаш і мы, каб высветліць, што адкуль, што пачым і што ў асартыменце.**

СТАР. 8



Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.

# «ХТО ПРАЦЯГНЕ БУДАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Свае інавацыйныя распрацоўкі прадставілі таксама Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Беларуская дзяржаўная акадэмія авіяцыі і Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі. Студэнты гэтых ВНУ атрымалі ўнікальную магчымасць напрамую пагаварыць з Прэзідэнтам. І яны яе не ўпусцілі — сустрэча працягвалася каля трох гадзін.

### Як бы банальна гэта ні гучала, вы — будучыня краіны

Тон сустрэчы быў зададзены адразу. «Вы будучыня нашай краіны. Як бы гэта банальна ні гучала, заўсёды было так, моладзь — будучыня нашай краіны. І вельмі важна тое, які ў вас настрой, што вы думаеце аб будучыні. Можа быць, нашы меркаванні не супадаюць. Тады давайце знойдзем пэўны кампраміс, як гэта павінна быць у разумных славян, беларусаў. Мы заўсёды былі людзьмі памяркоўнымі і кампраміснымі. Гэта вельмі важна», — адзначыў Прэзідэнт. Але найперш некалькі слоў на злобу дня.

«Інфаасяроддзе ўсіх нас зрабіла вельмі адкрытымі і, на жаль, уразлівымі. Вы гэта лепей за мяне разумееце. Вам, будучым спецыялістам у інфармацыйных тэхналогіях, электроніцы, не трэба расказваць аб хуткасці распаўсюджвання і здабывання даных аб любым чалавеку. І калі мы самі давяраем гэтыя звесткі гаджэту, то разумеем, што становімся не суб'ектам адносін, якія завязваюцца ў інфапрасторы, а аб'ектам», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што на яго рабочым стале часта з'яўляюцца даныя сацыялагічных даследаванняў з прэтэнзіяй на фарміраванне сацыяльнага партрэта сучаснай моладзі. «Але я ведаю, што ніводзін такі дакумент, ні адна дакладная запіска ці справаздача па актуальных праблемах маладзёжнай палітыкі не адкажуць на галоўнае пытанне: хто працягне будаваць і развіваць Беларусь?» — адзначыў Прэзідэнт. Менавіта гэта ён назваў прычынай сваіх сустрэч са студэнтамі. «Вы прыйшлі сюды, каб задаць свае пытанні Прэзідэнту, а я прыйшоў, каб убачыць вас, зразумець і скласці ўласную думку, знайсці адказ на гэтае пытанне, самае важнае для мяне сёння. Паўтару яго: хто працягне нашу гісторыю? Гісторыю суверэннай Беларусі. Кажу пра гэта шчыра і адкрыта», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

### Мы павінны знаходзіць адэкватныя рашэнні

Прэзідэнт расказаў, што яго раніца звычайна пачынаецца з агляду грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне і свеце. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сучасныя палітыкі, эксперты, аналітыкі канструктыўнай сусветнай большасці вымушаны гаварыць аб рэальнай сітуацыі, паўтараючы адзін і той жа наратыў — «свет на мяжы новай сусветнай вайны». Ён растлумачыў, што гэта кажуць не для таго, каб напалохаць. А для таго каб не адцягваць увагу на дурасці, не расслабляцца, канцэнтравацца на нацыянальных інтарэсах. «Я часта кажу: Беларусь — кавалак зямлі. Гэта не вызначэнне тэрытарыяльных маштабаў. Гэта пра тое, што свет вялізны. І нікому, акрамя нас, мы не патрэбны. Паверце майму досведу. Але калі паглядзець з пункту гледжання геапалітычных інтарэсаў іншых краін, то ўбачым іншы вобраз», — сказаў Прэзідэнт. Ён прывёў лічбы ў пацвярджэнне: адна Беларусь — гэта шэсць такіх дзяржаў, як Бельгія, пяць такіх краін, як Нідэрланды, больш за дзве з паловай Аўстрыі ці Чэхіі па тэрыторыі. «Мы можам размясціць у сябе народы ўсёй Прыбалтыкі і Малдовы. Гэта прыкладна. І не толькі размясціць. Можам апрануць і накарміць», — заўважыў беларускі лідар. Таксама ён дадаў, што ў нас ёсць лес і балоты — лёгкія Еўропы. «Нашы апрацаваныя палі, вада — рэсурсы, якія ў будучыні стануць на вагу золата, таму што не ў кожнай еўрапейскай краіне існуе такі запас і не ўсе яго берагуць, як гэта робім мы. Дарэчы, у перыяд Першай сусветнай вайны нас, не саромеючыся, рабавала Германія, пасля падзелу Беларусі ў 1921 годзе — Польшча. Нахабна вывозілі з тэрыторыі нашай краіны па вузкакалейках і торф, і лес, і харчаванне. А ў гэты час беларусы галадалі», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Але галоўнае, па яго словах, тое, што мы стаім на шляху да беспрэцэдэнтна і, на думку краін Захаду, несправядліва багатай гэтымі і іншымі рэсурсамі Расіі. «І далей на тэму палітычных і санкцыйных выпадаў з боку калектыўнага Захаду на адрас нашых з расіянамі дзяржаў можна не разважаць, — канстатаваў ён. — Вядома, сёння пытанне нумар адзін — гэта рэсурсы. Так было заўсёды ў нашай гісторыі. Сёння Захад валодае найвышэйшымі тэхналогіямі, якімі па асобных кірунках не валодае ні Расія, ні Беларусь. Тэхналогіі ёсць, але для іх патрэбны рэсурсы, каб вырабляць гатовыя вырабы — тыя ж беспілотнікі, прадукцыю на аснове штучнага інтэлекту і гэтак далей. Патрэбны рэсурсы. Патрэбны крыніцы рэдказямельных металаў. Дзе яны засяроджаны? Найперш у Расійскай Федэрацыі». Прэзідэнт падкрэсліў, што заўсёды высокатэхналагічны Захад імкнуўся на Усход, да скарбніц рэсурсаў. Так адбываецца і цяпер. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, як гісторык ён назірае, што кожныя 100 гадоў гісторыя паўтараецца.

«Важна, каб вы разумелі, чаму сучасныя палітыкі так шмат гавораць аб нацыянальных інтарэсах, суверэнітэце, дзяржаўнасці. Калі ўсё гэта страціць, то са статусу грамадзян сваёй краіны можна рэзка апусціцца на прыступку залежных ад чужой дзяржавы, стаць працоўнай сілай транснацыянальнага бізнесу. Хтосьці, можа, і зажыве багата, але не ўсе. Большасць — горш. І гэта мы таксама ў сваёй гісторыі праходзілі. Таму я шмат кажу пра сацыяльную справядлівасць і мір. Таму мы і працуем у названым напрамку. І нашы мірныя ініцыятывы абсалютна не пярэчаць контрмерам па абараназдольнасці, якія мы вымушаны прымаць, — заявіў Прэзідэнт. — Мы павінны рэагаваць на наяўнае становішча, прагназаваць далейшае развіццё падзей, знаходзіць адэкватныя рашэнні».

### Ведаем: усе цяжкасці часовыя. І гэта час магчымасцяў

Як заўважыў Прэзідэнт, Рэспубліка Беларусь — экспартаарыентаваная краіна. Краіна з адкрытай эканомікай. Таму, па яго словах, нас душаць санкцыямі, змушаючы ўвесь час шукаць новыя рынкі збыту і пастаўшчыкоў камплектуючых, выпуск якіх мы яшчэ не асвоілі. «І мы іх знаходзім. Ведаем, усе цяжкасці часовыя. І гэта час магчымасцяў. У глабальным свеце немагчыма закрыць трансфер тэхналогій або прадукцыі. Гэта проста нерэальна. Мы таксама гэта на практыцы разумеем. Больш за тое, санкцыі нас падштурхнулі, прымусілі варушыцца, ісці наперад. Канструктарскія бюро буйных прадпрыемстваў, Акадэмія навук Беларусі актыўна займаюцца імпартазамяшчэннем, у тым ліку, як я ўпэўніўся, і ВНУ. Гэта правільна, ды і выйсця ў нас іншага проста няма, калі мы хочам выжыць. Калі не навучымся рабіць камплектуючыя для сваёй прадукцыі, то гэтая прадукцыя нікому не будзе патрэбна», — сказаў беларускі лідар. Ён зрабіў акцэнт на тым, што сёння мы маем сучасныя аўтобусы і электробусы ўласнай вытворчасці. Выпрабляем і прадаём легкавыя аўтамабілі, трактары і камбайны, якія па якасці не горшыя за лепшыя імпартныя ўзоры. Ёсць дасягненні ў мікраэлектроніцы, нават ноўтбук свой зрабілі, у інфармацыйных тэхналогіях, фармацэўтыцы, біятэхналогіях. «Гэта я толькі малую частку назваў. Краіна развіваецца, людзі развіваюцца, — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. — І айчынны мабільны тэлефон, аб якім шмат цяпер гаворым, зробім. Абавязаны зрабіць. Таму што гаджэты, як вы бачылі апошнім часам, пераўтварылі ў баявую зброю. Гэта ўжо пытанне нацыянальнай бяспекі».

### Навукова-тэхнічная рэвалюцыя ў паскораным фармаце

Звяртаючыся да прысутных студэнтаў, Прэзідэнт прызнаўся, што вельмі хоча, каб яны рэалізаваліся ў сваёй прафесіі, стварылі сем'і, сталі бацькамі. «Усё гэта будзе. Галоўнае на гэтым жыццёвым шляху, каб вы ацэньвалі сітуацыю глабальна, бачылі сувязь паміж унутранай і знешняй палітыкай, разумелі сутнасць гістарычнага моманту», — параіў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, якую б пасаду ні займаў чалавек, ён нікуды не падзенецца ад палітыкі, таму ў ёй трэба разбірацца. Можа, нават не горш, чым у сваёй спецыяльнасці.

«Геапалітычныя канкурэнты робяць усё, каб збіць Беларусь са шляху ў новы эканамічны ўклад. Санкцыі, барацьба на інфармацыйным полі за свае каштоўнасці, традыцыі, гістарычную памяць забіраюць шмат сіл і рэсурсаў. Гэта праўда. Але праўда і тое, што мы ўсё ж ствараем сваю эканоміку, як гэта сёння модна казаць, лічбавую эканоміку, укараняем у жыццё элементы 6-га і 7-га тэхналагічных укладаў. «Разумныя» гарады, «разумны» транспарт, штучны інтэлект, беспілотнікі, інавацыйная вытворчасць — гэта будучыня, якую вы працягнеце ствараць, стаўшы дыпламаванымі спецыялістамі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Задачы перад галіной стаяць самыя амбіцыйныя. Паўтаруся. Мы павінны ў паскораным фармаце правесці навукова-тэхнічную рэвалюцыю. Таму развіццё інжынернай галіны для нас — стратэгічны кірунак, які вызначыць будучыню Беларусі. Мы не можам спыніцца, тым больш адстаць». Па яго словах, менавіта па гэтай прычыне будуць укладвацца сродкі ў развіццё перспектыўных тэхнічных кірункаў: робататэхніку, нанаэлектроніку, складаныя саманавучальныя сістэмы і іншыя.

«Планаў шмат. Але вярнуся да задачы нашай з вамі сустрэчы. Мне вельмі важна разумець, наколькі вы тонка ці не адчуваеце сваю адказнасць за будучыню краіны, наколькі добра вы арыентуецеся ў падзеях і фактах, якія фарміруюць міжнародны і ўнутраны інфармацыйны парадак дня. Мы, дарослыя, увесь час думаем, як вам растлумачыць, а вы шмат чаго самі бачыце і разумееце, робіце вельмі правільныя, мудрыя высновы. Таму і да вас прыйшоў на адкрытую размову», — звярнуўся да прысутных беларускі лідар.

### ? Што неабходна Прэзідэнту?

***Як і арыентаваў Аляксандр Лукашэнка, удзельнікі сустрэчы не саромеліся задаваць розныя пытанні, нават асабістыя. І першым было пытанне, якое, напэўна, цікавіць многіх: як утрымліваць у галаве такі масіў інфармацыі, з якім штодзень прыходзіцца сутыкацца Прэзідэнту. Інжынеры, зразумела, пацікавіліся, ці дапамагае ў гэтым штучны інтэлект або спецыяльныя аўтаматызаваныя праграмы.***

«Не думайце, што ў мяне галава адрозніваецца ад вашай. Дакладна такая ж галава. Проста трэба ўмець сістэматызаваць інфармацыю», — адказаў на гэта Прэзідэнт. Паводле яго слоў, гэта важна яшчэ і таму, што, акрамя вялікага аб'ёму інфармацыі, кіраўнік дзяржавы сутыкаецца з неабходнасцю прымаць мноства важных рашэнняў. І каб не памыліцца, трэба валодаць інфармацыяй, разбірацца ў ёй. «Разумееш: не дай бог, у такім грамадстве, як беларускае, дзе ў асноўным разумныя і адукаваныя людзі, зрабіць сістэмную, глабальную памылку. Гэта самае небяспечнае для любога кіраўніка, асабліва першай асобы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Таму неабходна раскладваць веды і інфармацыю «па палічках», як у бібліятэцы. Прэзідэнт расказаў, што такім чынам навучыўся працаваць з інфармацыяй яшчэ ў студэнцтве, за што, паводле яго слоў, да гэтага часу ўдзячны выкладчыкам. І, вядома, паводле яго слоў, вялікую ролю адыгрывае вопыт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра сваё сцвярджэнне аб тым, што прэзідэнтамі не становяцца, прэзідэнтамі нараджаюцца. «Калі ў цябе ад прыроды няма асноўных элементаў, уласцівасцяў і якасцяў прэзідэнта, не лезь у гэтую сферу. Я шмат цяпер думаю, натуральна, пераходны перыяд, разумею, што хтосьці прыйдзе пасля мяне, будзе кіраваць краінай. Дрэнна, добра... Гэта вы потым ацэніце, параўноўваючы. Усё спазнаецца ў параўнанні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што нядаўна назначыў шмат маладых службовых асоб, некаторым з іх няма і 40 гадоў. «Трэба, каб былі маладыя людзі. Але трэба, каб яны прайшлі пэўныя прыступкі. І мой досвед, маё прэзідэнцкае жыццё дазволілі мне гэтых людзей убачыць у справе. Яны выраслі ў мяне на вачах. І, прызначаючы, я разумею, што ў таго ці іншага чалавека ёсць досвед. Веды неабходны. Яны з'яўляюцца базай, падмуркам, на які кладзецца ваш вопыт. Вось гэта ўсё разам і гарачае жаданне зрабіць нешта карыснае будзе садзейнічаць таму, што ты будзеш больш-менш эфектыўна працаваць як прэзідэнт», — сказаў ён.

***У час размовы звярнулі ўвагу, што многія пытанні знешняй палітыкі вырашаюцца дзякуючы асабістым сувязям Прэзідэнта.*** Па яго словах, гэта таксама вельмі важны навык. «Вельмі шмат залежыць ад тваіх асабістых сувязяў. Вось наступны Прэзідэнт, за Лукашэнкам, ён павінен быць гатовы да таго, што яму трэба будзе на міжнароднай арэне даказваць свой узровень», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Дарэчы, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў сваёй рабоце не выкарыстоўвае ні штучны інтэлект, ні спецыяльныя аўтаматызаваныя праграмы, прывык працаваць па-старому. Але, паводле яго слоў, у гэта пытанне ён паглыблены, таму што за гэтым будучыня. Кіраўнік дзяржавы таксама падзяліўся сваімі асцярогамі наконт таго, што штучны інтэлект можа ўзяць людзей у палон, і калі ў выніку развіцця тэхналогій чалавецтва застанецца ўбаку, гэта будзе катастрофа. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ва ўсе перыяды гісторыі ў цэнтры ўсіх працэсаў стаяў чалавек. І гэта нельга страціць. Хоць сёння і без тэхналогій не абысціся. «Мы павінны гэта асвоіць, мы павінны гэтым валодаць. Гэта вельмі важна», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

***Як вядома, у графіку Прэзідэнта шмат і замежных камандзіровак. Студэнты пацікавіліся, якая была самай экстрэмальнай.*** Напэўна, іх здзівіла, што Прэзідэнт расказаў аб тым, што кожную камандзіроўку можна назваць экстрэмальнай, паколькі за пратакольнымі мерапрыемствамі часта хаваюцца вельмі напружаныя перагаворы. «Напэўна, самай экстрэмальнай была камандзіроўка ў мінулым годзе, калі ў Кітай, а потым нам у Афрыку прыйшлося ляцець», — прывёў прыклад кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, як на шляху з Кітая спыніўся ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, дзе правёў яшчэ некалькі рабочых сустрэч. «Потым паляцелі на ўсход Афрыкі, з усходу — на захад Афрыкі, з захаду — зноў на ўсход. Кеніяй мы, па-мойму, скончылі. І зноў вярнуліся ў Эміраты, сустрэліся з Прэзідэнтам, дамовіліся па нейкіх пытаннях. На гэта, па-мойму, больш за тыдзень сышло. Гэта сапраўды была экстрэмальная паездка, тым больш што гэта гарачыя краіны. А я чалавек паўночны, можна сказаць, я ненавіджу спякоту ўвогуле. Гэтыя дні для мяне былі выпрабаваннем», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы. Ён падзяліўся, што ў цэлым не любіць камандзіроўкі і цяжка пераносіць працяглыя паездкі за мяжу. «Таму я ні разу за ўсе свае прэзідэнцкія гады па-сапраўднаму ў адпачынку не быў. Толькі дома я магу адпачыць, хаця цяжка сказаць, што тут адпачынак. Я вельмі люблю сваю краіну, люблю яе прыроду. Унікальнае месца, дзе мы жывём», — падкрэсліў Прэзідэнт.

***Студэнты ўдакладнілі ў кіраўніка дзяржавы, ці лічыць ён экстрэмальным свой візіт у Югаславію ў 1999 годзе.*** Гэта паездка Аляксандра Лукашэнкі ў краіну, якая менавіта ў той час падвяргалася бамбёжкам, ужо стала гістарычнай. «Слухайце, Бялград... Я ўжо пра гэта і забыўся!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Тыя падзеі 25-гадовай даўніны ён назваў фашызмам з боку НАТА. Альянс так і не гарантаваў бяспеку палёту беларускага борта ў Югаславію. Больш за тое, ведаючы, што кіраўнік іншай краіны знаходзіцца ў Бялградзе, ажыццявілі авіяналёты. «Падлятаем да граніцы Югаславіі, да мяне заходзіць камандзір экіпажа і кажа: «Таварыш Прэзідэнт, нам загадана апусціцца на вышыню да кіламетра». Я зразумеў, што гэта такое. Яны думалі, што я развярнуся: гэта вельмі небяспечна. Я кажу: «Апускайся». Ён на мяне глядзіць: «Саб'юць!» Я кажу: «Не саб'юць, апускайся». І вось я сяджу каля ілюмінатара і гляджу: такое ўражанне, што мы слізгаем па верхавінах дрэў. Бачаць, што мы не спалохаліся. Мы падлятаем да аэрадрома — яны пачалі бамбіць Югаславію, ракеты лётаюць. Прызямляемся пад гэтую кананаду. Я нават не ведаў, што некаторыя з нашых нават парашуты з сабой узялі. Гэта была такая экстрэмальная паездка. Сербы гэта ацанілі і цэняць да гэтага часу», — успомніў кіраўнік дзяржавы.

***Маладыя людзі звярнулі ўвагу і на тое, што кіраўнік дзяржавы не карыстаецца мабільным тэле-***

# І РАЗВІВАЦЬ БЕЛАРУСЬ?»

***фонам. І ў працяг тэмы спыталі, на якой стадыі знаходзіцца распрацоўка айчыннага мабільнага тэлефона.*** Але гэта работа толькі пачынаецца, і казаць пра стадыі пакуль рана. Галоўнае тут, па словах кіраўніка дзяржавы, тое, што Беларусь ідзе сваім шляхам, стварае сваю тэхніку. Як вядома, нядаўна беларускія вытворцы прадставілі айчынны камп'ютар. І няхай там былі і імпартныя элементы, галоўнае, што пачатак пакладзены.

А што датычыцца мабільнага тэлефона, то Прэзідэнт прадставіў сапраўдны эксклюзіў. Ён расказаў, што карыстаецца мабільным тэлефонам закрытай сувязі. І нават паказаў яго. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў гэтым тэлефоне выкарыстоўваецца распрацоўка КДБ, якая не дазваляе праслухаць размову — гаворка кадзіруецца, а ў эфіры пры спробе перахопу размовы чутны гукі, падобныя да бульканання, дэшыфруецца яна толькі пры атрыманні сігналу на іншым такім жа апараце. У сувязі з гэтым гаджэт даволі масіўны, але ідзе работа над тым, каб зрабіць яго больш кампактным. Размаўляць па закрытай сувязі з Прэзідэнтам могуць каля 70 чалавек. Трапіць у дадзены пералік можна толькі з асабістага дазволу кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт адзначыў, што гэта распрацоўка крыптаграфічнай школы КДБ, якую ў Беларусі з часоў Савецкага Саюза захавалі, не разбурылі. І такая распрацоўка цікавіць і іншыя краіны.

## ? Калі замежнікі да нас едуць — гэта рэйтынг

***Студэнтаў, зразумела, цікавілі і пытанні ўніверсітэтаў. Напрыклад, у Прэзідэнта спыталі, ці лічыць ён неабходным удзел беларускіх універсітэтаў у міжнародных рэйтынгавых сістэмах.*** Адказ кіраўніка дзяржавы быў адназначны і зразумелы: «Калі ўніверсітэты хочуць быць у рэйтынгавай сістэме, то няхай будуць. Але я на гэта не зважаю, бо гэта ўсё палітызавана».

Аляксандр Лукашэнка назваў галоўным крытэрыем для ацэнкі ўніверсітэтаў запатрабаванасць сярод абітурыентаў, у тым ліку і замежных. Напрыклад, БДУІР сёлета нарасціў аказанне паслуг па экспарце на 5 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам, за кошт чаго фарміруецца практычна палова бюджэту ВНУ на год. «Вось гэта рэйтынг. Калі да вас замежнікі едуць — гэта рэйтынг», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь не толькі ў сферы адукацыйных паслуг, але і ў рэальным сектары эканомікі здольная вырабляць якасную прадукцыю найвышэйшага сусветнага ўзроўню. Зразумела, не ў такіх аб'ёмах, як у буйных дзяржавах. Але гэтага дастаткова для таго, каб дапамагаць і іншым краінам. Прэзідэнт прывёў у прыклад Венесуэлу, дзе беларускія спецыялісты стваралі цэлыя галіны як у грамадзянскай, так і ў ваеннай сферах. «Гэта значыць, мы ўмеем рабіць усё, што трэба. І тыя, каму трэба, ведаюць, да каго прыйсці», — рэзюмаваў беларускі лідар. Таму, па яго словах, трэба ісці сваім шляхам.

## ? Чырвоная лінія — гэта дзяржаўная граніца

***Не абышлося і без вострых надзённых тэм. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі канфлікт ва Украіне і выкліканыя ім праблемы. Згадалі і спробы ўцягнуць Беларусь у вайну, як і ў цэлым абвастрэнне абстаноўкі.*** Аляксандр Лукашэнка нагадаў свае словы, сказаныя падчас патрыятычнага форуму 17 верасня, — «нападзенне на Беларусь — гэта трэцяя сусветная вайна». «Дзякуй, нядаўна Пуцін гэта пацвердзіў, уносячы папраўкі ў ядзерную дактрыну, што напад на Расію і Беларусь — і мы прымяняем ядзерную зброю. Ён пацвердзіў мае словы. У гэтым сутнасць была маёй заявы», — удакладніў кіраўнік дзяржавы. Аднак, па яго словах, гэтага не хоча і Захад, яны да гэтага не гатовыя. «Але мы ім шчыра гаворым: чырвоная лінія — дзяржаўная граніца. Наступілі на яе — адказ будзе імгненны. Мы да гэтага рыхтуемся. Я шчыра і адкрыта пра гэта кажу», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар перакананы, што трэба дамаўляцца з украінцамі і спыняць вайну. Па яго словах, чалавечая памяць зарубцуе раны і адносіны паміж людзьмі з часам аднавяцца. «Толькі далей не трэба заходзіць тут. Трэба дамаўляцца. Гэта мая цвёрдая пазіцыя», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што беларусы па пэўных каналах падтрымліваюць кантакт з украінцамі. Адносіны з расіянамі навідавоку. «І мы стараемся на гэтых кантактах, каб нармальна было. Зяленскі пакуль гэтага не чуе і слухаць не хоча. Чаму? Таму што амерыканцы іх штурхаюць да гэтай вайны. Вайна выгадная Амерыцы, вельмі выгадная. Расія — гэта не галоўнае. Трэба Еўропу пастроіць. Вы не думайце, што амерыканцы і еўрапейцы — гэта адна сям'я. Амерыканцам моцная Еўропа не патрэбна», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама дадаў, што дзякуючы гэтай вайне ЗША развіваюць і свой ваенна-прамысловы комплекс, такім чынам, пакідаючы грошы ў сваёй краіне. Па словах беларускага лідара, у амерыканцаў ёсць свае мэты ў гэтай вайне, але ваяваць сваімі рукамі яны не хочуць, цынкавыя труны не падабаюцца амерыканскаму грамадству. «Таму проксі-вайна. Вось няхай украінцы дохнуць там, няхай забіваюць адзін аднаго з рускімі, няхай ваююць, а мы (амерыканцы) ім дадзім, чым ваяваць», — заўважыў беларускі лідар.

## ? «Ні ў якім разе не адрывайцеся ад зямлі»

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што расказаў усё гэта, каб маладыя людзі маглі арыентавацца ў тым, што адбываецца навокал. «Мая вам парада, зыходзячы з майго досведу, — ні ў якім разе не адрывайцеся ад сваёй зямлі», — сказаў ён. Як антыпрыклад кіраўнік дзяржавы прывёў збеглых, якія цяпер просяцца дадому. Ён прызнаў, што ў жыцці бывае ўсякае, але нагадаў, што за свае ўчынкі трэба несці адказнасць: «Бывае ж, як у нас у народзе кажуць, шарыкі за ролікі заскочылі. Памыліўся чалавек. Ну давай. Мы ж зацікаўлены ў тым, каб ты вярнуўся на радзіму. Гэта вельмі важна і для мяне асабіста. Але калі ты вінаваты, ты павінен адказаць па законе. Ідзі ў камісію», — сказаў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што ў 2020 годзе многія людзі несвядома ішлі ў агульнай масе. І гэта адна справа. Але былі і тыя, хто ўчыняў крымінальнае злачынства. І яны, па словах кіраўніка дзяржавы, будуць адказваць па законе. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што грошы, якія цяпер Захад выдзяляе на беларускіх збеглых і апазіцыю, трацяць вярхушка, а да астатніх гэтыя сродкі проста не даходзяць, і ім прыходзіцца выжываць у чужой краіне.

***У працяг тэмы ў Прэзідэнта спыталі, ці прадоўжыцца практыка памілавання асуджаных.*** «Так, працягваць я буду. Таму што гэта мая работа, канстытуцыйны абавязак Прэзідэнта — памілаваць чалавека. Таму трэба выконваць свае абавязкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, пры гэтым ён разумее, што сярод памілаваных будуць тыя, якія парушаць свае абяцанні больш не займацца дзейнасцю, за якую былі пакараныя. Так бывае.

«Таму я кажу: вы не адрывайцеся ад зямлі і ніколі не спяшайцеся. Цярпенне. І пачакаць трэба нейкі час. Менавіта так трэба паступаць. Ні ў якім разе з бухты-барахты нікуды не кідацца. Не спяшайцеся ніколі. Так, трэба ісці хутка, але не спяшаючыся. Акуратна. Думайце, вывярайце, збірайцеся, рыхтуйцеся», — параіў Прэзідэнт маладым людзям. Пры гэтым прызнаўся, што сам у маладосці прымаў і неразумныя рашэнні. Разам з тым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што яму вельмі падабаецца працаваць з маладымі людзьмі, перадаваць ім свой досвед і веды. Таму працу рэктара ўніверсітэта ён лічыць самай цікавай.

## ? Без вёскі не будзе Беларусі

***На пачатку размовы Прэзідэнт заўважыў, што ў Беларусі распрацоўваецца і прымяняецца канцэпцыя «разумнага» горада. А студэнты пацікавіліся, калі чакаць «разумную» беларускую вёску.***

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта нават прасцей, чым «разумны» горад, паколькі вёска несувымерна меншая. «Распрацуйце нейкую вёску, зробім яе «разумнай». Там крыху людзі іншыя, але, тым не менш, гэта можна. Калі ў вас ёсць такая ідэя і пад яе ёсць людзі, давайце зробім», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы. Ён падтрымаў меркаванне аб тым, што развіццё «разумных» вёсак можа паўплываць на жыццё краіны, паколькі аграрны сектар займае важнае месца ў структуры эканомікі Беларусі. «Трэба вызначыцца, якія функцыі мы пакінем гэтай «разумнай» вёсцы. Можа быць, асобныя, якія ў горадзе, нам і не патрэбны будуць там», — выказаў меркаванне Прэзідэнт. — Гэта будучыня. Паколькі ўсё ж такі душа ў нас такая... не тое што сялянская, больш на якасцях вясковая (мы людзі добрыя, спагадлівыя, гатовы падзяліцца апошнім, калектывізм у нас развіты). А гэта больш у вёсцы, яны жывуць адной сям'ёй. Без вёскі не можа быць Беларусі, не можа быць краіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў: вёска як мінімум апранае і корміць горад. Таму шмат увагі ўдзяляюць развіццю вёскі. «А развіваючы вёску, мы павінны самыя перадавыя тэхналогіі накіроўваць туды. У тым ліку і «разумную» вёску», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Ён упэўнены, што вясковыя жыхары з вялікім інтарэсам гэта ўспрымуць.

***Працягваючы сельскагаспадарчую тэму, у Прэзідэнта папрасілі вылучыць топ-5 любімых сельскагаспадарчых культур.*** «Без бульбы не абыдземся, — адразу адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Пасля бульбы я б паставіў яблыкі для Беларусі. Мы — яблычны край». Над астатнімі прыйшлося крыху падумаць. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што мог бы назваць і сліву, і абрыкос, і іншае, але гэта не жыццёва важныя культуры. «Кукурузу б назваў. Вельмі важная для нас. Выратавальніца. Клімат стаў больш сухі. Кукуруза расце, асабліва ў Гомелі. Гэта нас ратуе. З гэтага пункту гледжання. Канюшыну магу назваць і лён, бо яны на гербе...» — працягнуў ён.

Беларускі лідар прызнаўся, што ў цэлым вельмі любіць працаваць на зямлі. Ён расказаў, што некаторы час таму высадзіў сад, дзе ёсць і алыча, і персік. Прыжыліся ў Беларусі і кавуны, вырошчванне якіх Аляксандр Лукашэнка раней актыўна рэкламаваў. Прэзідэнт расказаў, што вельмі любіць сельскагаспадарчыя эксперыменты, выпрабоўвае і розную тэхніку. «Вось цяпер выпрабоўваю палівальную машыну. У нас, слухайце, столькі вады, столькі рэк. А побач з ракой поле сухое. Чаму мы не паліваем палі? Я вось на поўдні бываю, у азіяцкіх рэспубліках — у іх усюды ўвільготненыя глебы... А мы з рэчкі не можам выліць на суседняе поле. Вось я гэта цяпер эксперыментую. А потым гэта ўсё ідзе ў краіне. Але я сам павінен гэта паспрабаваць, павінен бачыць», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

## ? Пытанне якасці — найважнейшае

***Удзельнікі сустрэчы абмяркоўвалі не толькі надзённыя пытанні. Але і планы на будучыню. Наступны 2025-ы — год 80-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У Прэзідэнта спыталі, ці абмяркоўвалася правядзенне святочнага парада з удзелам краін, якія дапамагалі перамагчы фашызм.***

«Не абмяркоўваўся і абмяркоўвацца з-за пэўных прычын не будзе», — адказаў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што краіны Захаду не запрасілі прадстаўнікоў Беларусі і Расіі нават на нядаўнія памятныя мерапрыемствы ў Асвенцыме, які вызвалялі савецкія войскі. «Яны ўсе хіляць да таго, што гэта яны перамаглі і выратавалі планету ад карычневай чумы, а Савецкі Саюз, мы не мелі да гэтага ніякага дачынення. Хочуць пераарыентаваць увесь свет і перш за ўсё нас перакадзіраваць. Але мы ведаем, за кім праўда. Таму яны не будуць нас нікуды запрашаць. І разам з намі ніякіх мерапрыемстваў праводзіць не будуць. Я абсалютна перакананы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

***Кажучы пра 2025-ы, студэнты спыталі, якой тэме будзе прысвечаны наступны год.*** Прэзідэнт расказаў, што ў яго ёсць думкі прысвяціць усю наступную пяцігодку якасці — найважнейшай тэме. «Больш важнага пытання для Беларусі няма. Бо ўсё, што мы вырабляем, за кошт гэтага жывём. А ўсё, што мы вырабляем, вырабляе ўвесь свет. А як тады нам жыць, мы ж хочам сваё прадаць. А як прадаць? Калі будзе якасна. Для нас галоўнае пытанне цяпер — пытанне якасці. Не таму што ў нас дрэнная прадукцыя, але яна павінна быць на парадак вышэйшай па якасці. Гэта пытанне выжывальнасці». Таму і неабходна арганізаваць пяцігодку якасці. І па яе выніках адзначаць найлепшыя арганізацыі, прадпрыемствы, тавар. Аднак, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, гэта пакуль толькі развагі. Таму, па яго словах, ён адкрыты да прапаноў. Адна з іх прагучала — назваць наступны год Годам гістарычнай адказнасці. Прэзідэнт назваў гэтую думку цікавай і паабяцаў падумаць.

## ? У аснове павінна быць толькі праўда

***Разважаючы пра сучасныя праблемы, студэнты пацікавіліся меркаваннем Прэзідэнта наконт барацьбы з інфармацыйнымі выклікамі і пагрозамі.*** Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што ў свеце ідзе інфармацыйная вайна. У прыклад ён прывёў дзейнасць падраздзялення ўкраінскіх сіл спецыяльных аперацый ЦІПСА (Цэнтр інфармацыйна-псіхалагічных аперацый): «Хлусяць напраму. Памятаеце, Буча ва Украіне? Гэта была інфармацыйна-псіхалагічная аперацыя, і прытым наша разведка дакладна ўстанавіла, хто гэта быў. Гэта былі брытанцы, яны арганізоўвалі. Вось вам інфармацыйна-псіхалагічная аперацыя».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ў аснове беларускіх адказаў на гэта павінна ляжаць толькі праўда. Па яго словах, запуск у Беларусі новага тэлеканала — «Першы інфармацыйны» — пры ўсіх яго недахопах стаў адказам на дзеянне нядобразычліўцаў у інфармацыйнай вайне. «Я яго таксама крытыкую. Бачу, што яны пачалі рухацца ў больш самастойным напрамку. Але добры канал», — сказаў беларускі лідар. І прызнаўся: разам з сынам заўважылі, што іншыя каналы ўжо не глядзяць, а ўключаюць толькі гэты, каб атрымаць у комплексе асноўную інфармацыю. Таму, па словах Прэзідэнта, цяпер неабходна ўзнімаць узровень іншых айчынных тэлеканалаў.

## ? Без ІТ-тэхналогій немагчыма і развіццё эканомікі

***Удзельнікі сустрэчы, відавочна, у курсе асноўных пытанняў, якія знаходзяцца на парадку дня. Адзін з прысутных згадаў словы Прэзідэнта аб тым, што Беларусь не павінна адстаць у падрыхтоўцы кадраў для вядзення сучаснай вайны і ў прыватнасці спецыялістаў па беспілотніках, радыёэлектроннай барацьбе. Студэнты прапанавалі ў ВНУ, дзе няма ваенных кафедраў, адкрыць іх для падрыхтоўкі запатрабаваных па такіх кірунках спецыялістаў.*** Аляксандр Лукашэнка назваў такую ініцыятыву разумнай і даручыў Міністэрству абароны заняцца прапрацоўкай гэтага пытання сумесна з рэктарамі ўніверсітэтаў. Па яго словах, студэнты таго ж БДУІР могуць стаць самымі прафесійнымі аператарамі беспілотнікаў, таму што гэтая тэма ім вельмі блізкая. «Перадайце міністру абароны, каб заняўся гэтым, з рэктарам параіўся і мне далажылі, як мы гэта будзем рабіць», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што без ІТ-тэхналогій немагчыма і развіццё эканомікі. Але ён параіў не зацыклівацца на Парку высокіх тэхналогій. Па словах Прэзідэнта, ён сваю ролю адыграў. Ён будзе і далей працаваць, дзяржава будзе яго падтрымліваць. Але задачу, для якой ПВТ ствараўся, ён выканаў. Па словах беларускага лідара, калі ПВТ атрымаў шэраг прэферэнцый, спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук і буйных прампрадпрыемстваў затурбаваліся і пачалі развіваць уласныя ІТ-кампетэнцыі. Так у іх з'явіліся свае моцныя калектывы ІТ-спецыялістаў, якія ўжо пераўзыходзяць калектывы з ПВТ. «Вось галоўнае. Адтуль пачалося гэтае шэсце па ўсёй краіне», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Дзякуючы ўдзельнікам гэтай сустрэчы, сімвал ІТ-тэхналогій цяпер будзе і ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнту падарылі карціну, створаную штучным інтэлектам. Аўтар ідэі паставіў перад ім задачу паказаць Беларусь інтэлектуальнай, тэхналагічнай, прагрэсіўнай, аграрнай, а таксама прадставіць яе нацыянальныя сімвалы і акрэсліць яе месца ў свеце. Вынік уражвае. «Вельмі каштоўная штука. Прытым такім метадам атрымалася», — пракаментаваў падарунак Прэзідэнт. У заканчэнне сустрэчы ён падзякаваў удзельнікам і арганізатарам і паўтарыў сваю параду: «Вельмі прашу вас: думайце і не спяшайцеся».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# УЗБРОЕНЫ МУЗЫКАЙ

## Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, як служыцца пераможцу трэцяга сезона папулярнага музычнага праекта «ФАКТАР.BY»

**За Даніілам САВЕНЕМ без перабольшання назірала ўся краіна. Многія прарочылі сціпламу, але вельмі таленавітаму хлопцу са Слуцка перамогу, а ён проста рабіў тое, што любіць больш за ўсё на свеце, — спяваў. Здавалася б, пасля феерычнай перамогі ў праекце для Данііла ўсе дарогі адкрыты. Аднак малады чалавек выбраў шлях служэння не толькі музыцы, але і сваёй Айчыне, беларускаму народу — нядаўна ён папоўніў шэрагі Узброеных Сіл.**

Не сказаць, што гэта было проста. Па медыцынскіх паказаннях папулярны спявак мае адтэрміноўку ад прызыву на воінскую службу, але такі расклад Данііла, які з самага дзяцінства марыць служыць у арміі, не задаволіў, і ён адважыўся напісаць ліст Прэзідэнту.

«Назіраючы складаную геапалітычную абстаноўку вакол і адчуваючы трывожны дух часу, я, як грамадзянін маёй краіны, які дасягнуў прызыўнога ўзросту, не магу заставацца ўбаку», — сказана ў звароце да Галоўнакамандуючага. Будучы невідушчым ад нараджэння і цудоўна разумеючы, што не зможа належным чынам абыходзіцца са зброяй, Данііл у выглядзе выключэння папрасіў дазволіць яму прайсці ваенную службу па кантракце ў адным з музычных калектываў Узброеных Сіл. «Лічу, што ў цяжкі час для Радзімы музыка таксама можа быць дзеючай зброяй, — адзначана ў лісце кіраўніку дзяржавы. — Абавязваюся няўхільна выконваць усе абавязкі ваеннаслужачага ў поўнай адпаведнасці са статутам, прадугледжаным Міністэрствам абароны».

Няма нічога немагчымага. Галоўнакамандуючы жаданне Данііла падтрымаў. Вось ужо як другі месяц малады чалавек з'яўляецца артыстам заслужанага калектыву нашай краіны — Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

### Сіла мастацтва

Да новага статусу Данііл Савеня прызвычаіўся хутка. «Калектыў добры, рэпертуар шырокі», — дзеліцца ўражаннямі малады чалавек. Тым больш служыць у арміі ён марыў з самага дзяцінства. «Добра разумею, што мая мара — з разраду фантастычных, але цяпер гэта ўжо рэальнасць, — кажа Данііл. — Не магу спакойна глядзець на тое, што адбываецца ў свеце, і нічога не магу памяняць, але я магу памяняць свет вакол сябе. І мая краіна — той самы свет. Падчас сваёй службы ў арміі хачу рабіць нешта добрае — спяваць для ваеннаслужачых і грамадзянскіх асоб».

Артыст перакананы: музыка валодае магутным уздзеяннем на чалавека. І прыводзіць прыклад, як у гады Вялікай Айчыннай вайны працавалі канцэртныя брыгады. Музычныя калектывы рабілі сваю справу і падчас баявых дзеянняў у Афганістане. У прыватнасці, маральны дух ваеннаслужачым падымаў народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка.

«Можаце сабе ўявіць — усюды смерць, страты, і прыязджае такая канцэртная брыгада і спявае ў зямлянцы? — разважае Данііл. — Напрыклад, песню «До тебя мне дойти нелегко, а до смерти четыре шага»... Чуеш гэтую песню і разумееш, чаму трэба працягваць рабіць сваю справу. Спадзяюся, мне і нашаму ансамблю не давядзецца ўдзельнічаць у такіх мерапрыемствах, але гэта патрэбна і ў мірны час. У гарнізонах, дзе вельмі складаная служба, вечарам хлопцы валяцца з ног. І калі прыязджае да іх такая канцэртная брыгада, гучаць родныя сэрцу песні, няўжо гэта не здорава? Ці не ў гэтым наша прызначэнне як ансамбля?»

Ваеннаслужачы згадвае нядаўняе выступленне ў адной з воінскіх часцей, якая дыслацыруецца ў Слуцку. Прызнаецца, што не чакаў такіх эмоцый. Лічыць, што яго мэта — не зрабіць на кагосьці ўражанне, а данесці нешта важнае да асабовага складу, а яшчэ каб салдаты і афіцэры адпачылі, расслабіліся.

«Згодна са статутам, задача ваенных музыкантаў — падымаць баявы дух ваеннаслужачых Беларусі, — удакладняе Данііл Савеня. — Калі казаць больш зразумела, то наша задача — несці радасць і, калі трэба, дапамагчы ваеннаслужачым узяць сябе ў рукі, каб эфектыўна выконваць свае паўсядзённыя задачы. У моманты стомленасці часам дастаткова паслухаць добрую і прыгожую музыку. Няхай гэта будзе і ў полі. Музыка — наймацнейшая зброя. Пяццю гукамі можна прымусіць чалавека плакаць, смяяцца, успамінаць, спадзявацца».



### Меркаванне

Карэспандэнты «Звязды» пацікавіліся, як успрынялі ў калектыве новага артыста. Начальнік — **мастацкі кіраўнік Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Дзмітрый НАУМОВІЧ** расказаў, што з Даніілам вельмі цікава працаваць. «Спачатку было не зразумела, як будаваць з ім работу: Данііл прыйшоў да нас ваеннаслужачым па кантракце, што, вядома, ускладае на яго крыху больш адказнасці, чым на цывільных людзей, — адзначае кіраўнік ансамбля. — У працэсе знаёмства, работы з ім мы ўбачылі ў ваеннаслужачым выдатныя рысы характару. Данііл сапраўды вельмі таленавіты хлопец, ён па-іншаму ўспрымае музыку, адчувае гукі, валодае абсалютным слыхам, цудоўным тэмбрам, вельмі лёгка ўсё схоплівае, і з ім вельмі лёгка працаваць. Калектыў яго прыняў вельмі добра, бо прыйшоў адораны чалавек, тым больш прафесіянал. Мне здаецца, па ўспрыняцці жыццё ён больш дарослы, чым многія людзі ў ансамблі».

Дзмітрый Наумовіч лічыць, што напісаць ліст Галоўнакамандуючаму — вельмі мужны крок. «У Данііла няпросты лёс, і ён яго загартаваў, — тлумачыць начальнік ансамбля. — У яго ёсць пэўная жыццёвая пазіцыя, вызначаныя мэты, да якіх ён імкнецца. Усё гэта ўскладае на маладога чалавека адказнасць. Данііл ужо абсалютна адаптаваўся ў ансамблі, самастойна перамяшчаецца па пляцоўцы. Мне здаецца, што яму тут добра, бо вакол — людзі, якія з ім пасябравалі і прынялі ў калектыў. Спадзяюся, што яму цікава пастаянна мець зносіны з творчымі людзьмі».



### Жаданне, якое не спыніць

Расказваючы аб тым, што яго прымусіла напісаць ліст Прэзідэнту, Данііл Савеня ўдакладняе: калі ён прыняў рашэнне служыць у арміі, добра разумеў, што, згодна з заканадаўствам, гэта немагчыма. Але ўсё-такі адважыўся напісаць ліст Галоўнакамандуючаму. Аб тым, што яго просьба падтрымана, Данііл даведаўся ад намесніка начальніка ансамбля, які яму патэлефанаваў.

Сям'я хлопца сур'ёзна гэтую навіну не ўспрыняла. Акрамя прадзеда, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны загінуў падчас баёў у Франкфурце-на-Майне, са сваякоў ніхто не служыў. «Да майго рашэння паставіліся па-рознаму, — згадвае Данііл. — Хтосьці з неразуменнем, але з пэўнай павагай. Хтосьці знаходзіўся ў паўшокавым стане. Маўляў, нічога сабе, а такое магчыма? А нехта проста нейтральна. Розныя рэакцыі. Але маё жаданне нельга было спыніць. Яно было даўно і надоўга».

Ваеннаслужачы расказвае, што першапачаткова планаваў паспрабаваць свае сілы ва Узорна-паказальным аркестры Узброеных Сіл, але камандаванне распарадзілася, каб Данііл трапіў у Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл. І прычына простая — да Дома афіцэраў, дзе размяшчаецца калектыў ансамбля, Даніілу бліжэй дабірацца. У аркестр, які дыслацыруецца на тэрыторыі воінскай часці, трэба было б ехаць на іншы канец горада. Малады чалавек не прывык быць для кагосьці абузай, таму прыняў рашэнне на карысць ансамбля. Ён асвоіў грамадскі транспарт і карыстаецца ім без дапамогі навакольных.

На службу Данііл дабіраецца самастойна. Ен лічыць, што ваеннаслужачы не павінен прыносіць праблем. «Як бы гэта выглядала, калі б мяне, не дай бог, забіралі на машыне, суправаджалі? — не разумее ён. — Не хачу здавацца нейкім асаблівым. Зразумела, што меў быць з такой пазіцыяй на мяне некаторыя і глядзяць. Але быць асаблівым з пункту гледжання пэўных прэферэнцый я б не хацеў».

Цікаўлюся ў артыста, ці не стаміўся ён ад павышанай увагі. «Не сказаў бы, што яна суперпавышаная, каб ад яе стаміцца, — кажа Данііл. — Беларусы — дастаткова тактычны народ, яны ў асноўным дазваляюць сабе падыходзіць у кафэ або яшчэ дзесьці. Усякае, вядома, бывае. Як правіла, просяць сфатаграфавацца».

### Цырымонія, якая запомніцца надоўга

Данііл Савеня прызнаецца, што той момант, калі ён упершыню апрануў ваенную форму, не забудзе ніколі. «Адчуў найсур'ёзнейшую адказнасць, — успамінае ён гэты дзень. — Кожнае слова цяпер, кожнае рашэнне і нават кожны погляд можа несці за сабой пэўныя наступствы. Як ваеннаслужачы, я павінен разумець, што на мяне ўсё-такі глядзяць людзі і, напэўна, робяць высновы аб Узброеных Сілах у цэлым».

Не проста ўрачыстай цырымоніяй, а адной з найважнейшых падзей у жыцці стала для Данііла прыняцце Ваеннай прысягі. Падчас рытуалу прысутнічалі блізкія маладога чалавека, былі ўзняты Дзяржаўны сцяг, гучаў гімн Рэспублікі Беларусь — клятву, якую вымаўляюць усе ваеннаслужачыя краіны, вядомы спявак будзе памятаць вельмі доўга.

У дзевяць раніцы Данііл ужо ў ансамблі. Ён расказвае, што дысцыпліна ў калектыве — на вельмі высокім узроўні. І гэта, па яго словах, толькі на карысць: ніхто, напрыклад, не спазняецца, а таму работа ідзе хутка і эфектыўна. У цяперашні час артысты калектыву запісваюць партыі, рыхтуюцца да канцэртаў, у якіх ужо будзе ўдзельнічаць і навасьпечаны ваеннаслужачы. Работы, як прызнаецца Данііл, шмат, таму сумаваць няма калі. «Як мінімум сем твораў мне неабходна развучыць у найбліжэйшы час, — удакладняе ён. — А ўвогуле музычных твораў столькі, што складана нават уявіць. У ансамбля вельмі вялікі рэпертуар. У нас дастаткова шырокае поле дзейнасці».

Данііл расказвае, што пры выбары рэпертуару тут абавязкова прыслухоўваюцца да меркавання артыста. «Такога няма: начальнік загадаў — і ні кроку назад, — кажа ён. — Дзмітрый Юр'евіч — дастаткова лаяльны кіраўнік, які гатовы выслухаць. Не абыходзіцца і без загадаў. Гэта таксама трэба, бо іншы раз творчыя людзі некальскі самадзейныя. Часам іх трэба прыводзіць у форму. Усё-такі ансамбль — работа калектыўная. Тут вылучацца можна, але толькі там, дзе неабходна».

З калегамі малады чалавек хутка знайшоў агульную мову. «Мяне цёпла прынялі, — прызнаецца ваеннаслужачы. — Зразумела, што не без ваеннага гумару, але я сам магу пажартаваць, таму мне камфортна ў такім асяроддзі. Цікавяцца, як я жыву, як спраўляюся з тымі ці іншымі справамі. Напрыклад, як карыстаюся тэлефонам».

Вольны час малады чалавек у асноўным праводзіць дома. Любіць чытаць: мастацкую літаратуру або кнігі аб ваенных падзеях. Глядзіць фільмы і, вядома ж, спявае. Не супраць выйсці з сябрамі на прагулку.

### Дарагія людзі і гібкасць характару

Перамога ў музычным шоу «ФАКТАР.BY» адназначна змяніла жыццё Данііла. Яго не толькі

пазнаюць на вуліцы, а і часцей сталі запрашаць на канцэрты. Галоўным вынікам удзелу ў праекце, па меркаванні самога пераможцы, стала знаёмства з вельмі важнымі для яго людзьмі. Галоўным з іх, вядома, з'яўляецца настаўнік па праекце — Сяргей Пархоменка, або спявак Сярога. Данііл расказвае, што іх узаемаадносіны не спыніліся з завяршэннем музычнага шоу. Настаўнік і яго вучань часта гутараць па тэлефоне, бачацца, прадукцыйна супрацоўнічаюць. «Гэты чалавек мне шмат чаго даў у плане пэўных прынцыповых момантаў. Як таварыш, шмат падказаў таго, да чаго б я сам доўга ішоў», — кажа ваеннаслужачы аб сваім настаўніку не толькі па праекце, але і ў жыцці.

Добрыя адносіны Данііл падтрымлівае і з усімі, хто калісьці разгледзеў у ім талент і садзейнічаў яго раскрыццю. «Усё пачалося з дзіцячага сада, — узгадвае артыст. — Кіраўнік музычнага гуртка заўважыла ў мяне даныя, пачала прыцягваць да ранішнікаў. Потым у школе Тацяна Мікалаеўна, таксама кіраўнік музычнага гуртка, заўважыла мяне, і да пятага-шостага класа мы былі разам. Затым я прыйшоў на навучанне да Алены Віктараўны Атрашкевіч, з падачы якой паступіў у Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў».

Данііл лічыць сябе мяккім чалавекам. «Калі трэба, магу быць жорсткім, прынцыповым — увогуле характар у мяне гібкі, — кажа ён. — Лічу, што ваеннаслужачы павінен быць гібкім, бо, калі пастаянна быць толькі жорсткім або толькі мяккім, гэта не вельмі добра. А гібкасць вельмі важная ў камунікацыі. Патрэбна ўмець размаўляць з усімі катэгорыямі людзей. Ваеннаслужачыя ж маюць узаемаадносіны як з дарослымі, так і з дзецьмі».

## Бясцэнны вопыт і новая мара

Данііл прызнаецца, што ў сваім рашэнні — звязаць жыццё з арміяй — не расчараваўся. «Спадзяюся, што змагу прыўнесці нешта новае ў калектыў, — гаворыць ён. — У любым выпадку гэта каласальны вопыт. У першую чаргу, узаемадзеянне з людзьмі, якія ніколі не мелі ўяўлення аб такіх, як я. Можа, бачылі, але лічылі іх нямоглымі і бедненькімі (на жаль, бытуе такое меркаванне). Ніякія мы не бедненькія, у нас шмат што робіцца для інвалідаў. Грамадства павінна бачыць такіх людзей як мага больш, тады будзе разуменне, што аб нас можна клапаціцца, нам можна суперажываць, але ні ў якім разе нас нельга шкадаваць».

Артыст перакананы, што служба ў арміі зробіць яго мацнейшым, тут ён спазнае, што такое мужчынскае бескарыслівае сяброўства. «Важна быць патрэбным, карысным грамадству, — лічыць малады чалавек. — Можа, гледзячы на мяне, нехта задумаецца, што і яму трэба пайсці служыць. У рэшце рэшт, трэба ўмець абараняць свой дом — а раптам прыйдзецца. Нават некалькі выстралаў я паспею зрабіць у бок ворага, калі ў мой дом нехта прыйдзе. Вядома, няхай гэты навык лепш не спатрэбіцца».

Данііл марыць аб добрай сям'і, якая будзе яго любіць і падтрымліваць. Няма сумненняў, што гэтае жаданне ваеннаслужачага абавязкова спраўдзіцца, бо самая галоўная мара, нават няглядзячы на складанасць яе ажыццяўлення, — служыць сваёй Айчыне — ужо рэальнасць.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яна ГАРБАНЮКА, «Ваяр».**

Праверана на сабе. Жаночы погляд

# СУПРАЦЬ НЯБАЧНАГА ВОРАГА

## Чым займаюцца воіны-хімікі і якая іх роля?

**Каб даведацца гэта, карэспандэнт пабывала ў брыгадзе радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. Спектр задач гэтага падраздзялення даволі шырокі. Узнікла падраздзяленне ў 1918 годзе ў Рускім імператарскім войску. «Хімікі», як іх называлі калегі і цывільныя, прайшлі ўвесь шлях станаўлення Чырвонай і савецкай арміі. Галоўнымі выпрабаваннямі войскаў хімабароны сталі Вялікая Айчынная вайна, канфлікт у Афганістане і аварыя на Чарнобыльскай АЭС.**



40 воінскіх часцей у вогненных саракавых атрымалі ганаровыя найменні, 22 ваеннаслужачыя сталі Героямі Савецкага Саюза. Дэзактывацыяй і будаўніцтвам «саркафага» над чацвёртым энергаблокам ЧАЭС займаліся 10 палкоў і батальёнаў хімічных войскаў Узброеных Сіл СССР! Сучасныя беларускія войскі РХБ абароны былі сфарміраваны ў 1992 годзе. У 2022-м яны атрымалі назву войскаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны.

### ЗБРОЯ ДЛЯ МОЦНЫХ

Што стаіць на ўзбраенні войскаў РХБЗ? Пералічыць усё немагчыма — шмат вузкапрофільнай тэхнікі. Раскажам аб асноўным. Пачнём з агнямётаў. У арсенале тры тыпы: РВА «Рысь», «Чмель» і «ПДМ» — павышанай далёкасці і магутнасці.







Раскажам аб рэактыўным пяхотным агнямёце «Рысь». Агнямёт складаецца з пластыкавай пускавой устаноўкі, у канструкцыю якой уваходзіць ствол, пісталетная рукаятка кіравання агнём, ударна-спускавы механізм і сошкі. Ударна-спускавы механізм электрычны, абсталяваны імпульсным генератарам. Пасля ўзвядзення баявой спружыны ствараецца энергія, якая і ініцыіруе стрэл пры націску на спуск.

Вага пускавой устаноўкі складае каля 3,5 кілаграма, плюс зарад — гэта яшчэ звыш 12 кг. Агнямёт — зброя для моцных хлопцаў. Узгаранне адбываецца пасля таго, як капсула пакінула ствол. Пасля гэтага яна трапляе ў цэль, і распырскваецца агнясумесь. Тэмпература ў зоне паражэння складае каля 1000 градусаў. Зброя кропкава знішчае жывую сілу ў накрытых агнявых пунктах, будынках, аўтамабілях.

### АЭРАЗОЛЬНАЯ ЗАСЛОНА

Перад тым, як выйсці на агнявую мяжу, разлікі трэніруюцца на асобнай пляцоўцы. Баявую стральбу весці мне не дазволілі, таму ўдалося праверыць на сабе толькі вучэбны агнямёт. Гэта спецыяльны трэнажор, унутры якога размешчана не агнясумесь, а ствол малакаліберны вінтоўкі. Стрэл ён робіць толькі патронам 5,6 мм.

Для чаго патрэбна аэразольная заслона? Перадыслацыруемся на наступную мяжу. Тут нас чакае разлік спецтэхнікі. Я была ўпэўнена, што ў войску ўжо знаёмая з усім узбраеннем, але з гэтым сутыкнулася ўпершыню.

Гэтая машына называецца тэрмадымавая апаратура. Яна прызначана для таго каб ствараць аэразольную заслону. Навошта гэта трэба? Для ўтойвання важных аб'ектаў, мастоў, баявой тэхнікі, а таксама лжывых аб'ектаў. Танкі і самалёты адлюстроўваюць інфрачырвонае выпраменьванне — яны становяцца мішэнню для дронаў і высокадакладнай зброі. А пры дапамозе вось такой аэразольнай заслоны тэхніку можна лёгка замаскіраваць. Апаратура можа працаваць да 13 гадзін без перапынку, пасля гэтага яна дазапраўляецца.

Выкарыстанне дымавой маскіроўкі ў войсках мае даўнюю гісторыю. Гэты прыём ужываўся і ў Першую, і ў Другую сусветную вайну. У маштабнай аперацыі дым упершыню выкарыстоўваўся падчас контрнаступлення пад Сталінградам. Тады ад нямецкага камандавання неабходна было схаваць задуму аперацыі, напрамкі галоўных удараў войскаў і месцы засяроджвання сіл і сродкаў.

### ПАМЫЛКА, ЯКАЯ ДОРАГА КАШТУЕ

Першае, што прыходзіць у галаву, калі гаворка заходзіць аб войсках РХБЗ, — гэта, вядома ж, процівагаз і спецыяльная экіпіроўка. Дарэчы, сёння гардэроб воінаў-хімікаў адрозніваецца разнастайнасцю: гэта і касцюмы супраць хімічнага, радыеактыўнага заражэння і біялагічнай абароны. Як гаворыцца, «усё па апошнім піску моды»... Дакладней, згодна з сучаснымі патрабаваннямі абароны.

Зараз я прымераю на сабе процівагаз, падганю яго і выйду для выканання задачы. Па легендзе нашай трэніроўкі, сапернік распыліў атрутныя рэчывы. Нашы вайскоўцы цалкам экіпіраваліся, і перад тым, як накіравацца ў раён, яны павінны прайсці праверку на герметычнасць процівагазаў у спецыяльнай тэхнічнай палатцы.

Унутры памяшкання вайскоўцы спецыяльна распылілі аэразоль. Ён правакуе слёзы, кашаль, увогуле непрыемныя адчуванні. Калі процівагаз падагнаны правільна, то баец нічога не адчуе, а вось калі абы-як, то плакаць ён будзе горкімі слязамі. У прамым сэнсе гэтага слова.

Я вырашыла праверыць, ці правільна экіпіравалася:

— Вы жывыя, хлопцы?

— Так.

— Не адчуваецца нічога?

— Пах.

— Я баюся. Я буду заходзіць спінай.

Заходжу ў палатку:

— Чаму ў мяне слязяцца вочы? А ў вас слязяцца вочы?

— Нармальна.

— Што значыць нармальна? Слязяцца ці не?

Унутры я вытрымала літаральна хвіліну:

— У мяне жудасна слязяцца вочы, значыць, я няправільна падагнала свой процівагаз.

Відавочна, я ўсё зрабіла няправільна. Памылка каштавала мне слёз і насмарку. А калі б гэта былі атрутныя рэчывы, то, хутчэй за ўсё, і жыцця.

### У БАРАЦЬБЕ З ЭПІДЭМІЯЙ

Адна з задач войскаў РХБЗ — разведка мясцовасці. Экіпіраваныя ваеннаслужачыя на спецыяльнай тэхніцы накіроўваюцца ў раён, дзе, як мяркуецца, магло адбыцца заражэнне любога характару. У першую чаргу, яны збіраюць інфармацыю аб факце, характары і маштабах надзвычайнага здарэння. Бяруцца пробы паветра, зямлі, вады. Заражаныя ўчасткі абазначаюцца спецыяльнымі знакамі. Тэрыторыя старанна ахоўваецца. Вярнуўшыся ў пункт дыслакацыі, уся тэхніка і ўзбраенне апрацоўваюцца спецыяльнымі сродкамі.

Дарэчы, беларускія воіны-хімікі адыгралі значную ролю ў барацьбе з эпідэміяй COVID-19. Яны працавалі суткі напралёт, ажыццяўляючы дэзынфекцыю адміністрацыйных будынкаў, школ, бальніц, вуліц нашых гарадоў. Дзякуючы ў тым ліку іх рабоце, эпідэмія пайшла на спад. У сваю чаргу, хацелася б пажадаць вайскоўцам выконваць задачы толькі на палігонах. А эпідэміі і радыяцыйныя заражэнні няхай застануцца выключна ў дакументальных фільмах і на старонках падручнікаў.

**Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ.**
**Фота з архіва аўтара.**

# ЛІЧБАВЫ СУВЕРЭНІТЭТ, РЭГУЛЯВАННЕ БЛОГАСФЕРЫ І БУДУЧЫНЯ МЕДЫЯЛАНДШАФТУ КРАІНЫ

## Якія пытанні ўздымаюцца падчас І Форуму блогераў, што гэтымі днямі праходзіць у Мінску

**У першага падобнага мерапрыемства, арганізатарам якога з'яўляецца Міністэрства інфармацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, красамоўная назва — «БлогБай. Нам ёсць што сказаць!» У тым ліку з гэтай мэтай, а яшчэ каб падзяліцца вопытам з калегамі, даведацца актуальную інфармацыю з вуснаў вядомых медыяэкспертаў і журналістаў, у сталіцу з'ехаліся прадстаўнікі блогасферы з усіх рэгіёнаў краіны. Акрамя таго, у форуме прымаюць удзел прадстаўнікі прэс-службаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, спецыялісты ў сферы масавых камунікацый Беларусі і Расіі.**

**Акрамя пленарнага пасяджэння, у праграме форуму — адукацыйная лекцыя, тэматычныя экскурсіі, тэарэтычныя і практычныя лекцыі ад кіраўнікоў і журналістаў аўтарытэтных СМІ, папулярных блогераў.**



### «Каб краіна заставалася такой жа мірнай, трэба папрацаваць»

«Мы сабраліся, каб пагаварыць, пагутарыць, можа быць, нечаму навучыцца, але, самае галоўнае, — атрымаць уражанні і выпрацаваць пэўную формулу камунікату дзяржавы з блогерамі і блогераў — з дзяржавай, — звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, расплумачыў мэту мерапрыемства **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ.** — Вельмі хачу, каб вы атрымалі, у першую чаргу, задавальненне і нейкія веды, якія, магчыма, вам спатрэбяцца».

Кіраўнік інфармацыйнага ведамства звярнуў увагу на тое, што агульная аўдыторыя ўсіх блогераў, якія ўдзельнічаюць у форуме, — больш як 27 мільёнаў падпісчыкаў. «Гэтыя людзі на вас арыентуюцца, яны вас слухаюць, звяраюць свае думкі з вашымі, — канстатаваў міністр. — Гэта накладвае пэўную адказнасць, і я хачу, каб аб гэтай адказнасці мы сёння таксама пагаварылі».

Па словах Марата Маркава, ад блогерскай супольнасці сёння залежыць нямала. «Каб краіна заставалася такой жа прыгожай і, самае галоўнае, мірнай, крыху трэба папрацаваць, — канкрэтызаваў ён. — Не толькі Міністэрству інфармацыі, Міністэрству адукацыі або «Белтэлекаму», Адміністрацыі Прэзідэнта, але і ўсім вам у першую чаргу».

Міністр інфармацыі прапанаваў блогерам расказаць пра гэты форум так, каб на яго хацелася сабрацца ўсім тым, хто сюды не трапіў. «Вельмі хачу, каб тым, хто ўдзельнічае ў мерапрыемстве (а яно сапраўды ўнікальнае), яно настолькі спадабалася, што яны сказалі: міністэрства, рабіце яшчэ, — патлумачыў Марат Маркаў гэты пасыл у размове з журналістамі. — Калі мы не будзем збірацца разам, калі не будзем разумець, наколькі гэта важна сёння для краіны і кожнага з нас, — значыць, мы альбо нямногага варты, альбо проста не любім сваю краіну, а яе любіць трэба».

### «Журналісты СМІ і блогеры — гэта ўсе грамадзяне нашай краіны»

У размове з журналістамі **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ** адзначыў важнасць супрацоўніцтва блогераў і журналістаў дзеля будучага медыяландшафту краіны. «Блогеры — гэта такія ж грамадзяне нашай краіны, гэта людзі сацыяльна актыўныя, людзі, якія прадстаўляюць у блогах свой пункт гледжання, свае адносіны да тых ці іншых аб'ектаў, якія яны адлюстроўваюць у сваім блогаасяроддзі, — канстатаваў ён. — Яны маюць вялікую аўдыторыю. Значыць, іх меркаванне, іх погляд на тую ці іншую сферу цікавыя вялікай колькасці людзей. І многія з гэтых людзей жывуць далёка за межамі нашай Беларусі».

Таксама намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта лічыць важным супрацоўніцтва журналістаў традыцыйных медыя і тых, хто прадстаўляе так званую грамадзянскую журналістыку. «Яшчэ раз паўтару: і журналісты СМІ, і блогеры — гэта ўсе грамадзяне нашай краіны, гэта тыя, хто жадае лепшага нашай краіне, людзям, якія тут жывуць, жадае росквіту і прыгажосці, дабрабыту свайму маленькаму рэгіёну або той сферы, пра якую яны складаюць свае блогі, у якой яны, магчыма, працуюць і разумеюць значна лепш і больш, чым журналіст, які прыехаў туды на здымкі», — растлумачыў ён.



Кажучы аб лічбавым суверэнітэце, Уладзімір Пярцоў падкрэсліў, што правілы гульні мяняюцца. У прыватнасці, выразаюцца альтэрнатыўныя для Захаду каналы з Беларусі і Расіі. І Telegram пасля затрымання Паўла Дурава, па яго словах, ужо не будзе такім свабодным, якім ён здаваўся яшчэ ўчора. Пры гэтым намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта расказаў, што ў Саюзнай дзяржаве развіваюць свае платформы, і заклікаў блогераў выкарыстоўваць іх для размяшчэння аўтарскіх відэа.

«Мы разумеем, што інтэрнэт і ўсё, што ў ім адбываецца, ніколі ўжо не будзе такім, якім ён быў 15 ці нават 10 гадоў таму, — рэзюмаваў Уладзімір Пярцоў. — У такім асяроддзі мы з вамі знаходзімся — ва ўмовах, калі супраць нас усіх вядзецца гэтая інфармацыйная агрэсія. І я вельмі прашу вас заставацца такімі ж патрыятычнымі людзьмі, якія жадаюць жыць, ствараць і дабівацца росквіту роднай Беларусі».

### «Наша задача — каб кантэнт, які выпрацоўваецца на карысць Беларусі, знаходзіўся на нашых серверах»

**Старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван ЭЙСМАНТ** звярнуў увагу на тое, што ў сучасных умовах блогеры з'яўляюцца не толькі стваральнікамі кантэнту, але і важнымі ўдзельнікамі інфармацыйнага поля. Па яго словах, Белтэлерадыёкампанія адкрыта да супрацоўніцтва з блогерамі. «Асабліва гэта датычыцца тых, хто займаецца грамадска-палітычнай журналістыкай і блогерствам, — удакладніў кіраўнік СМІ. — У нас хапае эфірнага часу. Мы, праўдзівей пэўныя перагаворы і абмяркоўваўшы тэматыку, гатовы выдзеліць час для вас — тых, хто хоча гэтым займацца: вытворчасцю і генерыраваннем інфармацыі, у першую чаргу аналітычных матэрыялаў».

Іван Эйсмант расказаў аб эфектыўнасці навінавай сістэмы ў інфармацыйнай вайне, прэзентаваў новыя праекты, якія нядаўна запусціла Белтэлерадыёкампанія, — канал «Першы інфармацыйны» і сайт навін «news.by».

Яшчэ адзін інфармацыйны прадукт, які нядаўна з'явіўся ў айчынным медыяасяроддзі, прэзентавала **генеральны дырэктар БелТА Ірына АКУЛОВІЧ.** Размова ідзе пра партал VIDEOBEL.BY, дзе на адной платформе змешчаны нацыянальны грамадска-палітычны кантэнт.

Па словах медыяменеджара, патрэбна была платформа, якую не будуць цэнзураваць па амерыканскай адмашцы. У гэтай сувязі Ірына Акуловіч нагадала выказванні Прэзідэнта Беларусі: «Нам не трэба чужога, свой дабрабыт мы створым самі, сваёй працай і на сваёй зямлі». А для гэтага, па словах гендырэктара БелТА, патрэбен уласны рэсурс. «Галоўная асаблівасць VIDEOBEL.BY у тым, што ў адным месцы можна глядзець усё самае важнае, — падкрэсліла яна. — Партал адаптаваны пад усе платформы: тэлефон, тэлевізар, камп'ютар. Наша задача — зрабіць партал зручным для карыстальніка». Невыпадкова кожнае відэа разбіваецца на тэматычныя адрэзкі. Аднак па гэтай прычыне яно не адразу з'яўляецца на партале пасля яго выхаду ў эфір на нацыянальных каналах.

«Цяпер, працуючы невялікай камандай, мы, безумоўна, не можам размясціць тут усё відэа, — паведаміла Ірына Акуловіч. — Але ў найбліжэйшы час гэта стане магчымым. Гэта неабходна рабіць, бо наша задача — каб кантэнт, які выпрацоўваецца на карысць Беларусі, знаходзіўся на нашых серверах».

### «Блогерства — гэта з'ява, частка вялікага працэсу»

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН** паразважаў на тэму «Блогерства: свабодная творчасць або адказная грамадзянская журналістыка?»: «Як палітолаг, я не веру ні ў твітарныя, ні ў фэйсбучныя, ні ў тэлеграмныя, ні ў ніякія іншыя блогерскія рэвалюцыі, — падкрэсліў ён. — І нават праслаўленых тэлеграм-канал, які ў нас на слыху быў у 2020-м, — гэта толькі частка працэсу. Гэта вельмі важны момант, каб мы ўсведамлялі і не апынуліся ў той сітуацыі. Блогерства — з'ява, частка вялікага працэсу. Ні ў якім разе не трэба думаць, што тыя перамены, тыя вялізныя змяненні, аб якіх мы часткова сказалі, мяняюць нешта надоўга».

У гэтай сувязі Вадзім Гігін задаў блогерам некалькі пытанняў, на якія, па яго меркаванні, павінен адказаць кожны прадстаўнік блогасферы. «Ці з'яўляецца блогер журналістам і ў якой частцы ён становіцца журналістам? Вельмі важна — ці лічыце вы сябе журналістам? Другое пытанне — ці павінен блогер быць стапрацэнтным экспертам у тым, аб чым мы гаворым? А я вам скажу, што адны з самых аўтарытэтных экспертаў у арміі нават не служылі. Тым не менш людзі ім давяраюць, калі яны разважаюць аб перамяшчэнні танкавых калон, прымяненні батальённых тактычных груп, чаму гэтая тактыка ўжо састарэла і інш. Гэта абмяркоўваюць людзі, якія аб арміі разумення не маюць, тым не менш у іх сур'ёзныя падпіскі».




Звярнуў увагу палітолаг і на яшчэ важны момант — ці ёсць неабходнасць у блогерскай этыцы? «Ёсць шматлікія спробы яе распрацаваць, але нешта мне падказвае, што нярэдка поспех у гэтай сферы ляжыць праз парушэнне этычных норм», — патлумачыў ён. Вадзім Гігін папярэдзіў блогерскую супольнасць аб тым, што многіх блогераў выкарыстоўваюць або будуць спрабаваць гэта зрабіць і з палітычнага пункту гледжання. «І перад вамі стане пытанне — хто вы ў палітыцы: інструмент, аб'ект, удзельнік або вы нейтральную пазіцыю хочаце заняць? — канкрэтызаваў свой тэзіс медыяэксперт. — І калі вы захочаце мець нейтральную пазіцыю, не факт, што вас у ёй пакінуць, бо ўсё роўна ўсе мы з'яўляемся заложнікамі гэтага вялікага працэсу».

### Адсутнасць рэгулявання блогасферы і сакрэт поспеху

**Начальнік аддзела ГУБАЗіК МУС Артур ГАЙКО** агучыў праблему адсутнасці рэгулявання блогасферы і падкрэсліў, да якіх негатыўных тэндэнцый гэта можа прывесці. «Я рэгулярна праводжу розныя даследаванні, камунікую з людзьмі, якія аказаліся схільнымі да экстрэмісцкага ўплыву, — паведаміў ён. — Напэўна, усе чулі гэтую заезджаную фразу: «Я паддаўся ўплыву дэструктыўных Telegram-каналаў». Гэта я чую ў 90 % выпадкаў».

Артур Гайко звярнуў увагу блогерскай супольнасці на неабходнасць трансляцыі праўдзівага кантэнту і пазбягання фэйкаў. «Напэўна, сацыяльныя, палітблогеры бачылі, што шмат у каго няма межаў і рамак дазволенасці, — канкрэтызаваў ён. — Хтосьці вельмі часта пераходзіць на асобы, пачынаюцца, як кажуць на слэнгу, халівары. Гэта ўсё з-за адсутнасці рэгулявання блогасферы». У гэтай сувязі начальнік аддзела ГУБАЗіК МУС лічыць правільнай ініцыятыву ўсім сабрацца, пагаварыць, убачыць адзін аднаго і ўжо далей ад гэтага адштурхоўвацца. У той жа час, па яго словах, у нашай краіне ёсць і дастойныя блогеры, якіх трэба было б прасоўваць.

У форуме таксама браў удзел вядомы сярод моладзі **блогер з больш чым мільённай аўдыторыяй, спявак і тэлевядучы тэлеканала МУЗ-ТБ Улад КАБЯКОЎ,** які падзяліўся сакрэтам свайго поспеху і расказаў аб уплыве блогераў на сучаснае грамадства. Ён звярнуў увагу і на важнасці пашырэння прысутнасці тэлебачання ў інтэрнэт-асяроддзі, каб яно карысталася большай папулярнасцю ў моладзі.

«Тэлебачанне павінна ствараць не толькі навінавыя ролікі, але і забаўляльныя інтэрнэт-праекты: такія, як музычныя шоу і чэленджы, — лічыць малады чалавек. — Калі АНТ пачне здымаць не толькі шортсы з навін, але і чэленджы, гэта будзе проста бомба. Я ўжо заўважаю з'яўленне беларускіх тэлеканалаў на платформах, і гэта станоўчы крок у кірунку лічбавага развіцця».

Кажучы аб уплыве блогераў у палітычным парадку дня, блогер-мільённік перакананы, што ва ўмовах інфармацыйнай вайны важна кантраляваць не толькі тое, што даносіцца да аўдыторыі, але і хто гэта робіць. «Прыкладам таму служыць досвед у Расіі, дзе блогеры актыўна ўдзельнічаюць у сацыяльна значных праектах, — канкрэтызаваў ён. — Адным з такіх праектаў стала акцыя па зборы гуманітарнай дапамогі дзецям Данбаса сумесна з губернатарам Маскоўскай вобласці. Важна, каб блогеры дапамагалі людзям, а людзі — блогерам, каб усе трымаліся разам».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# З ДУШОЙ І КЛОПАТАМ

## БЫЦЬ КАРЫСНЫМ У ЛЮБЫМ УЗРОСЦЕ

Як адзначыла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА,** працэс старэння з'яўляецца доўгатэрміновым трэндам, што абумоўлівае комплексныя падыходы ў сацыяльнай палітыцы па падтрымцы пажылых грамадзян. Яны замацаваны ў Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030», якая прадугледжвае меры па розных кірунках жыццядзейнасці пажылых грамадзян. Дакумент паслужыў моцным стымулам для іх развіцця.

**«Пенсіённая сістэма функцыянуе стабільна, забяспечваецца своечасовасць выплаты пенсіі... Галоўная задача ў галіне пенсіённага забеспячэння — арыентацыя на рэальны рост пенсій, і яна выконваецца».**

У прыватнасці, у краіне дзейнічае 140 саветаў пажылых грамадзян, у якіх задзейнічана больш чым паўтары тысячы чалавек. Яны — своеасаблівы рупар грамадскай думкі: пажылыя людзі ўдзельнічаюць у жыцці свайго рэгіёна, у розных мерапрыемствах, уносяць прапановы. Штогод праводзяцца абласныя злёты пажылых грамадзян, і сёлета яны пройдуць на працягу кастрычніка ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Штогод павялічваецца колькасць валанцёраў сярэбранага ўзросту. Паводле даных Белстата, сёння доля пажылых грамадзян, ахопленых валанцёрскай дзейнасцю, складае 15 %. Растуць валанцёрскія атрады, якія створаны пры цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Колькасць тых, хто з'яўляецца валанцёрамі ў нашых цэнтрах, павялічылася апошнім часам на 30 % і складае 4,5 тысячы.

Акрамя таго, у цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання запатрабаваны праграмы нефармальнай адукацыі, навучання лічбавай, камп'ютарнай дасведчанасці. Сёння дзейнічае 220 гурткоў, якія аб'ядноўваюць 3,6 тысячы грамадзян старэйшага пакалення. Расце попыт з боку людзей старэйшага пакалення на фізічную актыўнасць, і сёлета ўжо трэці раз пройдзе рэспубліканскі марафон па скандынаўскай хадзе. Летась было пяць тысяч удзельнікаў. Старт спаборніцтваў будзе дадзены ў Мінску 30 верасня ў 11:00. Падрабязней пра яго можна даведацца ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання па месцы жыхарства.

## У МУЗЕІ, НА ФЕСТЫВАЛЬ ТАНЦАЎ ЦІ КОНКУРС ПРЫГАЖОСЦІ

Штогод у верасні—кастрычніку традыцыйна праходзіць акцыя «Павага. Клопат. Адказнасць». Яна прымеркавана да Дня пажылых людзей і накіравана ў першую чаргу на праяву клопату і ўвагі да старэйшага пакалення з боку моладзі. У рамках акцыі 1 кастрычніка 150 музеяў па ўсёй краіне адчыняць дзверы для бясплатнага наведвання па пенсіённым пасведчанні. 2 кастрычніка гэта зробіць Нацыянальны мастацкі музей. Да марафону добрых спраў сёлета далучыцца Нацыянальная бібліятэка — яе можна наведаць 1 кастрычніка з 10 да 21:00. Акрамя таго, 1, 2, і 3 кастрычніка будуць арганізаваны экскурсіі па часе, устаноўленым бібліятэкай.



У Мінску ўсіх ахвотных чакаюць на фестывалі «На крылах танца», а традыцыю правядзення танцавальных баляў у гэтым годзе працягне Гомельская вобласць — там пройдзе абласны баль «Чараўніцтва восені». 5 кастрычніка ў Мінску адбудуцца чарговыя адкрытыя рэспубліканскія спартыўна-масавыя спаборніцтвы «Актыўнае даўгалецце». Шэраг мерапрыемстваў пройдзе ў рэгіёнах. Сярод іх — конкурс прыгажосці «Бенефіс жанчыны — 24» для дам элегантнага ўзросту, запланаваны на 2 кастрычніка ў Лідзе.

— Па ініцыятыве Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў наступным годзе ў рамках праграм Саюзнай дзяржавы мы правядзём саюзны злёт грамадзян старэйшага пакалення «Мы за актыўнае даўгалецце». Ён пройдзе ў Віцебску ў верасні, будзе прымеркаваны да Дня пажылых людзей і аб'яднае 250 чалавек з Расіі і Беларусі. Збяруцца як прадстаўнікі старэйшага пакалення, так і эксперты па пытаннях геранталогіі, сацыяльнага абслугоўвання, дадатковай адукацыі дарослых, — расказала Марына Арцёменка.

**Штогод у верасні—кастрычніку традыцыйна праходзіць акцыя «Павага. Клопат. Адказнасць». Яна прымеркавана да Дня пажылых людзей і накіравана ў першую чаргу на праяву клопату і ўвагі да старэйшага пакалення з боку моладзі. У рамках акцыі 1 кастрычніка 150 музеяў па ўсёй краіне адчыняць дзверы для бясплатнага наведвання па пенсіённым пасведчанні.**

## СЯРЭДНЯЯ ПЕНСІЯ СКЛАДЗЕ 852 РУБЛІ

Неад'емнай часткай сістэмы дзяржаўнай падтрымкі сёння з'яўляецца пенсіённае забеспячэнне. Пенсіянерам у Беларусі з'яўляецца кожны чацвёрты жыхар краіны.

— Пенсіённая сістэма функцыянуе стабільна, забяспечваецца своечасовасць выплаты пенсіі. Выдаткі на выплату пенсій у нас штогод складаюць каля 9 % ВУП, і гэта супастаўна з развітымі краінамі. У 2024 годзе на гэтыя мэты будзе накіравана больш за 22 мільярды рублёў. Галоўная задача ў галіне пенсіённага забеспячэння — арыентацыя на рэальны рост пенсій, і яна выконваецца. У лютым на 10 % былі павялічаны памеры ўсіх працоўных пенсій, а па рашэнні кіраўніка дзяржавы з 1 кастрычніка будзе праведзены другі перараазлік працоўных пенсій. У сукупнасці памер пенсіі павялічыцца на 15 %. Паводле ацэнкі сярэдні памер працоўнай пенсіі пенсіянера, які не працуе, у кастрычніку складзе 852 рублі, — паведаміла намеснік міністра.

Пры гэтым кожны пяты пенсіянер працягвае працаваць, а гэта 445 тысяч чалавек (21,5 працэнта ад агульнай колькасці пенсіянераў). У новым праекце Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях занятасці насельніцтва» для павышэння канкурэнтаздольнасці на рынку працы грамадзянам за пяць гадоў да дасягнення пенсіённага ўзросту ўстаноўлены дадатковыя гарантыі. Адна з іх — захаванне для беспрацоўных дадзенай катэгорыі выплаты дапамогі па беспрацоўі на працягу шасці месяцаў (для іншых катэгорый гэты перыяд скарачаецца). Акрамя таго, працаўладкаванне за кошт устаноўленай броні (раней за два гады да ўстаноўленага пенсіённага ўзросту, цяпер — за пяць). Магчымая і поўная або частковая кампенсацыя наймальнікам выдаткаў на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі. 25 верасня члены Савета Рэспублікі адобрылі гэты законапраект.

Для прыцягнення ў працоўную дзейнасць людзей пажылога ўзросту праводзяцца сярэбраныя кірмашы вакансій. Сёлета іх прайшло 90, былі ахоплены тысячы чалавек, а свайго наймальніка знайшлі больш за 300 чалавек. Усяго за першае паўгоддзе бягучага года аказана садзейнічанне ў працаўладкаванні 700 грамадзянам перадпенсіённага і 2,6 тысячы грамадзян пенсіённага ўзросту.

## ДАГАВОРЫ ПА СІСТЭМЕ «3+3» ЗАКЛЮЧЫЛА 36 ТЫСЯЧ БЕЛАРУСАЎ

Фарміраванне камфортнага ўзроўню даходаў для пажылых рэалізоўваецца, у тым ліку, і праз дадатковыя механізмы, у прыватнасці дадатковыя назапашвальныя пенсіі з фінансавай падтрымкай дзяржавы (так званая сістэма «3+3»). Па стане на верасень, з дзяржаўным прадпрыемствам «Стравіта» заключана больш чым 36 тысяч дагавораў страхавання дадатковай назапашвальнай пенсіі. Таксама эфектыўным механізмам павелічэння даходаў у будучыні для працоўных пенсіянераў з'яўляецца праграма «Адкладзеная пенсія», якая дазваляе сфарміраваць дадатковую прэмію за больш позні пачатак атрымання пенсіі. На сёння такой праграмай скарысталіся пяць тысяч чалавек.

Яшчэ адзін важны напрамак — сацыяльнае абслугоўванне пажылых грамадзян. У краіне дзейнічае 146 цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і 81 сацыяльны пансіянат. Адзначаецца рост попыту на сацыяльныя паслугі па прычыне старэння насельніцтва. Па статыстыцы за апошнія пяць гадоў колькасць атрымальнікаў сацыяльных паслуг павялічылася на 20 % (на 26 тысяч чалавек), а ў бягучым годзе яна вырасла ўжо на сем тысяч чалавек. Усё больш запатрабаванымі становяцца сацыяльныя паслугі дома, асабліва для асоб з дэменцыяй, а таксама праграма нефармальнага догляду. Колькасць пажылых грамадзян, якія атрымліваюць паслугі па доглядзе дома, у краіне складае больш за 100 тысяч чалавек.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Трафік танкераў у Суэцкім канале знізіўся амаль удвая



Колькасць суднаў, якія праходзяць праз Суэцкі канал, у мінулым месяцы значна знізілася ў параўнанні з аналагічным перыядам летась, што звязана з геапалітычным канфліктам у рэгіёне. Трафік балкераў скараціўся на 39 працэнтаў, а танкераў — амаль на 50 працэнтаў, адзначаецца ў даследаванні сэрвісу па адсочванні і ацэнцы судоў VesselsValue. «Сітуацыя застаецца нявызначанай, суднаходныя кампаніі, верагодна, будуць працягваць выбіраць даўжэйшыя і бяспечныя маршруты, што прывядзе да далейшых збояў у глабальных гандлёвых патоках», — лічаць аналітыкі VesselsValue. З пачатку ваенных дзеянняў у рэгіёне суднаўладальнікі і аператары ўсё часцей выбіраюць даўжэйшы маршрут вакол мыса Добрай Надзеі ў паўднёвай частцы Афрыкі, нягледзячы на дадатковыя выдаткі на паліва і павелічэнне да двух тыдняў (у залежнасці ад хуткасці судна) часу транзіту, які дадае некалькі тысяч міль да падарожжа.

### Каралеўская сям'я абыходзіцца Вялікабрытаніі ў паўмільярда фунтаў у год



Утрыманне каралеўскай сям'і насамрэч абыходзіцца брытанскім падаткаплацельшчыкам у 510 млн фунтаў (680 млн долараў) у год, а не ў тыя 86 мільёнаў, што афіцыйна выдзяляюць з бюджэту. Так лічыць брытанская антыманархічная арганізацыя Republic, паведаміла «Бі-бі-сі». У сваім новым дакладзе яна падсумоўвала не толькі выдаткі на ўтрыманне караля і прынцаў з прынцэсамі, але і страты, якія нясе казна Брытаніі з-за таго, што вялікая колькасць зямлі і нерухомасці належыць не дзяржаве, а каралю. Цяперашняе становішча антыманархісты лічаць «скандальнай растратай народных грошай». «Як можна казаць аб уразанні зімовых кампенсацый за ацяпленне, калі мы транжырым паўмільярда фунтаў на каралеўскую сям'ю?» — заявіў кіраўнік арганізацыі Republic Грэм Сміт. Букінгемскі палац адмовіўся пракаментаваць «Бі-бі-сі» гэты даклад.

### Навукоўцы выявілі каля Новай Зеландыі новы від «акул-прывідаў»



Гэтых рыб вельмі цяжка заўважыць, паколькі яны жывуць на вялікай глыбіні ў Ціхім акіяне — да 2,5 тысячы метраў. Хімеры адносяцца да атрада храстковых рыб — у іх няма лускі, а шкілет цалкам складаецца з храсткоў. Даследчыкі з Нацыянальнага інстытута водных і атмасферных даследаванняў Новай Зеландыі (Niwa) выявілі гэты від у раёне акіянічнага дна на ўсход ад краіны. Даследчыца Брыт Фінучы расказала, што гэтае адкрыццё стала для яе захапляльным: «З-за асабліваасцяў асяроддзя пасялення іх цяжка вывучаць і адсочваць, таму мы мала што ведаем пра іх біялогію». Першапачаткова лічылася, што аўстралійская хімера адносіцца да аднаго з відаў, распаўсюджаных па ўсім свеце. Аднак пазней даследаванні паказалі, што яна генетычна адрозніваецца ад сваіх суродзічаў і жыве выключна ў водах Аўстраліі і Новай Зеландыі.

# «Ешце вітаміны, пакуль яны танныя!»

## КАЛІ ЗНІЖАЮЦЬ ЦЭНЫ?

Пытанне кошту, калі гаворка ідзе аб сезонных кірмашах, становіцца ключавым — тут апрыёры павінна быць танна. Прынамсі, танней, чым на стацыянарных рынках гэтага канкрэтнага населенага пункта. Інакш страчваецца сэнс. Вопытныя гаспадыні ведаюць, што танней за ўсё сельгаспрадукцыя на такіх пляцоўках становіцца прыкладна да сярэдзіны — канца кастрычніка, калі ў прадаўцоў найбольшая канкурэнцыя. Гэта высветлена эмпірычным шляхам, і гэта ж пацвярджаюць спецыялісты сферы гандлю.

— Зразумела, што цэны на сезонных кірмашах і ў верасні будуць ніжэйшыя, чым на буйных рынках краіны. Але найбольш нізкімі яны бываюць звычайна да самага актыўнага часу правядзення кірмашоў — гэта пачатак—сярэдзіна кастрычніка. Да гэтага моманту і прадаўцоў, і прадукцыі больш чым дастаткова. Асабліва зніжэнне цэн датычыцца агароднінных адкрытага грунту (бульба, буракі, капуста, цыбуля, морква), — растлумачылі ў галоўным упраўленні гандлю і паслуг Мінгарвыканкама.

Інфармацыя, зрэшты, справядлівая не толькі ў сталіцы, але і ў іншых гарадах краіны. Ну, а што да ўзроўню цэн, то іх на такіх кірмашах, тык бы мовіць, фарміруе рынак. Нягледзячы на ўдзел буйных вытворцаў, усё ж сярод прадаўцоў на сезонных кірмашах пераважаюць фізічныя асобы — прыватнікі. А заканадаўства не прадугледжвае рэгуляванне цэн у рамках работы фізічных асоб. Таму цэны крыху вышэйшыя ў верасні і становяцца ніжэйшымі да пачатку—сярэдзіны кастрычніка — у гэты час на кірмашы даязджаюць тыя, хто не прыехаў у пачатку восені.

Ну, а мы наўмысна адправіліся на галоўную сезонную гандлёвую пляцоўку сталіцы — каля комплексу «Чыжоўка-Арэна» — у самыя «дарагія» дні. То-бок, у верасні, практычна адразу пасля адкрыцця сельгаскірмашоў, каб заспець цэнавы максімум і або абурыцца («Ну і апетыты ў вас, дарагія таварышы прыватнікі!»), або парадавацца, што ўсё быццам бы па кішэні. Забягаючы наперад, з задавальненнем канстатую: хутчэй другое, чым першае. Сезонная прадукцыя сёлета сапраўды прадаецца па досыць дэмакратычных цэнах: рублёў на дваццаць можна накупіць ёмістую торбу гародніны, асабліва калі выбіраць самыя недарагія пазіцыі: моркву, бурак, грунтавыя памідоры, адвечную беларускую антонаўку... Агуркі, заўважым, да недарагіх пазіцый восенню не належаць: іх сезон амаль прайшоў, і таму яны ўжо дарагія.

## ГІСТОРЫЯ З ГЕАГРАФІЯЙ

Гандлёвыя пляцоўкі, дзе прапануецца сезонная экалагічна чыстая, мясцовая сельгаспрадукцыя, сёлета ў наяўнасці практычна ў той жа колькасці, што і мінулай восенню. У Мінску, напрыклад, з 14 верасня кожныя выхадныя працуе каля 150 такіх пляцовак. Летась іх было крыху менш. Калі надвор'е дазволіць (гэта значыць, тэмпература паветра не апусціцца ніжэй за нуль — па санітарных нормах, у гэтым выпадку рэалізацыя сельгаспрадукцыі на адкрытым паветры забаронена), то прадоўжаць работу яны сёлета ў рэгіёнах — да пачатку лістапада, а ў сталіцы — аж да 1 снежня. Лакацыі таксама засталіся звыклымі. У Мінску, напрыклад, галоўная гандлёвая пляцоўка — каля комплексу «Чыжоўка-Арэна» (там вялікая паркоўка, што зручна і прадаўцам, і пакупнікам), таксама папулярны кірмаш каля Палаца спорту на Нямізе. Па раёнах: стаянка ГЦ Simax на выхадныя ператвараецца ў кірмаш у Заводскім раёне, пляцоўка побач з комплексам ЗАТ «Інвабуд» — у Кастрычніцкім, каля кінатэатра «Кіеў» — у Цэнтральным, каля ГРЦ «Цівалі» — у Фрунзенскім і гэтак далей. Не памянялі размяшчэння асноўныя сезонныя кірмашы і ў іншых населеных пунктах, расказалі прадстаўнікі гандлю: мясцовыя жыхары іх добра ведаюць і за многія гады праклалі туды сцяжынку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паркоўка каля «Чыжоўка-Арэны» і сапраўды велізарная — разлічана на амаль паўтары тысячы машынамесцаў. І ў выхадныя яна ператвараецца ў сапраўды велізарны рынак: шэрагі, здаецца, сыходзяць за гарызонт. Але пакупнікоў, гавораць прадаўцы, быццам бы на ўсіх хапае. Завяршае работу галоўны сезонны рынак гадзіны ў чатыры дня і ў суботу, і ў нядзелю. Кірмашы меншыя, у раёнах сталіцы, працуюць даўжэй, гадзін да шасці. Проста многія жыхары двухмільённага мегаполіса напачатку едуць непасрэдна сюды, на Чыжоўку, не звяртаючы ўвагі на кірмашы бліжэйшыя: цікава ж паглядзець і потым параўнаць з тымі, што каля дома.



На «Чыжоўка-Арэне» сёлета прадстаўлена прадукцыя, мусіць, усіх рэгіёнаў Беларусі. Хоць пераважае, як мне падалося, Брэстчына. Зрэшты, выразнага «геаграфічнага» падзелу тут, як аказалася, няма. Побач з Пінскам і Столінам — прадукцыя з Самахвалавіч, а прадаўцы з-пад Маладзечна — побач з «калегамі» з Глыбокага.

— У мінулыя гады ездзілі на Брэст, зараз вось у Мінск прыехалі. Тут пакупнікоў больш. Распрадаць усё можна яшчэ да абеду, — кажа Васіль з Пінска.

Ва ўпраўленні гандлю Мінгарвыканкама расказалі, што з году ў год на такіх кірмашах (у ліку іншых прадаўцоў, зразумела, нямала і тых, хто гэтай восенню прыехаў гандляваць у сталіцу ўпершыню) працуюць адны і тыя ж фермеры і прыватнікі: прыязджаюць з Брэсцкага, Гомельскага, Гродзенскага, Віцебскага рэгіёнаў адрасна, да свайго пакупніка, які чакае пэўны сорт бульбы, капусты або цыбулі. Суразмоўца пацвярджае: так і ёсць, у многіх тутэйшых прадаўцоў — доўгая гісторыя гандлю на сезонных кірмашах у сталіцы і напрацаваны пастаянныя кліенты.

## МАРА ВЕГЕТАРЫЯНЦА

Што з асартыментам? У гэтым годзе, як і ў мінулым, вялікая прапанова па памідорах, грунтавых і цяплічных. Першыя — ад двух рублёў за кіло, сярэдні кошт — 2.20—2.50. На галоўным сезонным рынку сталіцы памідоры, здаецца, таннейшыя сярод кірмашоў Мінска.

— Смачныя памідоры? — цікавіцца пакупніца. Зразумела, для праформы: хто ж свой тавар лаяць будзе? Але адказ пакупніца атрымлівае нестандартны:

— Асабіста я наогул грунтавыя памідоры не ем! — заяўляе вясёлы дзядзечка са Століна.

Ад нечаканасці мы з пакупніцай, якая задала стандартнае спажывецкае пытанне, дружна смяемся: нічога сабе антырэклама! Але прадавец не губляецца:

— Проста я сумленны. Калі пытаюцца пра грунтавыя памідоры, ці смачныя, шчыра адказваю: мне не падабаюцца, а вось жонка такія любіць. Людзі ёсць, якія толькі грунтавыя ядуць. А я толькі цяплічныя ем, і агуркі таксама. Я проста вельмі прыдзірлівы — цяплічныя таксама не ўсякія есці буду. Але гэтыя, грунтавыя, усё роўна будуць смачнейшыя, чым у краме — гэта ж памідор сапраўдны, які саспеў на корані, на зямлі, без хіміі. Хочаце, разрэжу вам памідор пакаштаваць? Праўда, ён не мыты. Баклажаны я, дарэчы, таксама не ем. Хаця... ёсць жа любіцелі, хто прыгатуе! — па-філасофску заключае ён.

Памідоры, дарэчы, аказаліся смачнымі. У сумленнага прадаўца я іх усё ж купіла, па 2.20 за кіло. Баклажаны на «Чыжоўка-Арэне», дарэчы, таксама танныя — у сярэднім 2—2.50 за кілаграм (на іншых кірмашах Мінска сярэдні кошт — 3 рублі за кіло).

— Па антовым кошце аддаём, — кажа прадавец.

А вось перац (з тоўстымі сценкамі, накшталт сорту «Каліфорнія») тут чамусьці даражэйшы, чым на іншых кірмашах па Мінску: кілаграм каштуе ад 4 рублёў да 4.20 і нават 4.50. Танкасценны салодкі перац (звычайны для нашых шырот, зялёненькі або жаўтлявы) каштуе стандартныя 2 рублі за кілаграм.




— Пакуль усё танна, трэба есці, самы сезон: і перчыкі, і зеляніну, і памідоркі. Ад'ядацца трэба вітамінамі, — кажа прадавец з Самахвалавіч.

Здаецца, «капеечны» бізнес, але за кошт аб'ёмаў атрымліваецца дастаткова выгадна, разважае ён.

— Сёння памідораў кілаграм сто пяцьдзясят прадалі. На заўтра кілаграм сто засталося. А потым толькі ў наступныя выхадныя прыедзем. За тыдзень паспеюць новыя — і перцы, і памідоры. У нас яны і на грунце растуць, і цяплічы таксама ёсць.

Цяплічныя памідоры буйныя, жоўтыя, малінавыя, шакаладнага колеру, амаль чорныя і нават у палоску каштуюць сёлета ад 3-4 да 5-6 рублёў.

— Цяпер самыя смачныя з цяплічных — малінавыя і жоўтыя, «пальчыкі» — кіславатыя, на аматара, — кажа дзяўчына-прадавец. — Калі цяплічны памідор купляеце, выбірайце буйныя: яны чым большыя па памеры, тым смачнейшыя.

Нечакана дарагія кабачкі: ідуць па кошце баклажанаў, хоць (у адрозненне ад памідораў) чым больш кабачок, тым ніжэйшая цана за кілаграм (знайшла варыянт нават па рубель 20 капеек). Яшчэ з дарагіх пазіцый — агуркі. Іх кошт даходзіць да 5 рублёў, хаця можна набыць каля «Чыжоўка-Арэны» і па 3 рублі за кілаграм. Цыбулю ў сетцы прадаюць па 1.50, россыпам даражэй, але даражэй чыста сімвалічна: па 1.60.

Морква-бурак гэтай восенню — ад 80 капеек да 1.20-1.50 за кіло. Па паўтара рубля за кілаграм прадаюць гарбуз.

— Гэты сорт добра бяруць, такія гарбузы могуць стаяць да вясны, зімой прыдумаеце, што з іх прыгатаваць, — рэкламуе свой тавар суразмоўніца.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Аукцион состоится **31.10.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.10.2024** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600077220

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Миноблавтотранс» филиал «Автобусный парк № 1»**
*(продавец, место нахождения: Минская область, г. Солигорск, Любанское шоссе, 22)*
проводит открытый аукцион

**по продаже автомобиля грузового двухосного бортового GAZ-3307,**
**год выпуска не установлен (установлена кабина 2014 г. в.), регистрационный знак АК 4298-5, рама № 330700Е0221766, цвет – белый, находящегося по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Любанское шоссе, д. 22.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 9 746,40 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены **– 974,00 бел. руб.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

**Условия аукциона:**
- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенном по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 02.08.2024.

Электронные торги состоятся **14.10.2024** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.10.2024** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64. Тел. для осмотра (8044) 543-84-60.**

УНП 601070315

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **УП «БЕЛТА»**
на праве хозяйственного ведения **(Продавец).**

Аукцион состоится **16.10.2024 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

**Лот № 1:** SUBARU OUTBACK,
легковой универсал, кузов (рама) № JF1BR9L95BG055737.
Начальная цена с НДС 20 % – 30 816,00 руб.
**Место нахождения:** г. Минск, ул. Энгельса, 30.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by и на электронной торговой площадке Организатора аукциона gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

Утерянное свидетельство о государственной регистрации Общества с ограниченной ответственностью «Сыровер», выданное Мингорисполкомом 30.10.2020, регистрационный номер 193484994, **считать недействительным.**

# «АДЧУВАЮ ШЧАСЦЕ АД СУСТРЭЧЫ З ЧЫТАЧАМІ...»

**Кацярыну ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВУЮ, здаецца, ведае ўся краіна. Пісьменніца, якая настойліва, праз многія гады, працуе з разлікам на дзіцячага чытача. Настаўніца з немалым педагагічным стажам. Часты ўдзельнік сустрэч з чытачамі. У сецiве ёсць розныя супольнасці фанатаў яе твораў, яе казачных герояў. А што сама Кацярына думае пра беларускую дзіцячую літаратуру, як ацэньвае айчыннае кнігавыданне, як увогуле ставіцца да кнігі і чытання? Да ўвагі чытачоў — гутарка з пісьменніцай на самыя розныя тэмы.**

***— Ці можа сёння пісьменнік быць задаволены стасункамі з выдаўцамі?***

— Мая першая кніга выйшла ў 2004 годзе. І вось ужо на працягу дваццаці гадоў я супрацоўнічаю з выдавецтвамі, таму лічу, што пэўны досвед маю. Згадваю, што перад тым, як наважылася выдаваць сваю першую кнігу, чула ад паспяховых і вядомых пісьменнікаў, што шлях літаратара вірлівы і складаны. Што акрамя таленту ён патрабуе шчырай самаадданасці, каласальнай працаздольнасці і пастаяннага самаўдасканалення, бо выдаць кнігу і знайсці сваіх чытачоў зусім няпроста. Мне, пачаткоўцу, было зразумела, якія сур'ёзныя задачы ставіць пісьменніцкая дзейнасць. Але яна вельмі вабіла мяне, таму вырашыла паспрабаваць выпусціць першую кнігу. Азіраючыся на досвед двух дзесяцігоддзяў, магу сказаць, што і дваццаць гадоў таму, і сёння пісьменнік можа быць задаволены і ўдзячны выдаўцам за супрацоўніцтва.

Але часам да наладжанага працэсу сумеснай работы вядзе няпросты і, бывае, доўгі шлях. Поспех прапанаванаму да выдання рукапісу можа забяспечыць у першую чаргу якасны тэкст, які будзе цікавы мэтавай аўдыторыі, тэма павінна адпавядаць запатрабаванням чытачоў, быць актуальнай. Яшчэ важна, каб стос падобных рукапісаў не чакаў свайго часу ў рэдактарскім партфелі выдавецтва, бо ў такім выпадку можна доўга стаяць у чарзе. Дадам яшчэ, што праца пісьменніка заключаецца не толькі ў стварэнні вартага тэксту. З кнігай, якая пабачыць свет, неабходна працаваць, годна і цікава яе прадстаўляць, усімі магчымымі спосабамі даносіць яе да чытачоў. І гэта павінна ажыццяўляцца ў цесным і пастаянным супрацоўніцтве з выдавецтвам.

***— Вы працуеце з адным ці некалькімі выдавецтвамі? За кім звычайна рашэнне — да вас звяртаюцца ці вы прыходзіце з новым рукапісам?***

— На сёння ў маім творчым багажы трыццаць выдадзеных кніг, якія выйшлі ў сямі буйных выдавецтвах. Дваццаць з іх выпусціў Выдавецкі дом «Звязда». Калектыўныя зборнікі, у якіх друкаваліся мае творы, дадаюць яшчэ некалькі назваў у спісе выдавецтваў, з якімі супрацоўнічаю. Пэўна, у кожнага пісьменніка ёсць выдавецтва, у якім выходзіць большасць яго кніг. Аўтары спрабуюць прапаноўваць свае рукапісы ў розныя ўстановы, але потым кожны знаходзіць сваё асноўнае выдавецтва. Першая мая дзіцячая кніга выйшла ў «Мастацкай літаратуры», а потым паступіла новая цікавая прапанова, якая стала стартам шматгадовага творчага супрацоўніцтва. Са «Звяздой» я ад пачатку, як толькі ў гэтым першым у краіне медыяхолдынгу з'явілася кнігавыданне. Дарэчы, першая мая кніга, рукапіс якой я прынесла на нязменны і такі знаёмы мне адрас Захарава, 19, выйшла на пачатку 2012 года, калі выдавецтва называлася «Літаратура і мастацтва», а ўжо на тытуле наступнай было напісана «Звязда». У маім пісьменніцкім лёсе гэта асаблівая ўстанова, што можна лёгка заўважыць па колькасці выдадзеных там кніг. Я ўдзячна супрацоўнікам выдавецтва за наша даўняе і плённае творчае сяброўства, за дзясяткі кніг, якія мы разам стварылі і з іх прэзентацыямі аб'язджаем усю Беларусь, каб сустрэцца з юнымі чытачамі кожнай вобласці. Сапраўдны літаратурны марафон!



У Выдавецкім доме «Звязда» з 2019 года мае кнігі выходзяць у асобнай серыі «Казкі Кніжнай Феі». Прыемна, што выдавецтва зацікаўлена ў новых рукапісах, таму пастаянна прыношу свае творы. Але прапановы ад іншых выдавецтваў таксама бываюць, і час ад часу і там з'яўляюцца мае кнігі. За некалькі апошніх гадоў друкавалася ў выдавецтвах «Мастацкая літаратура», «Беларусь», «Народная асвета», «Благовест»...

***— А як, між іншым, складваюцца рашэнні па перавыданні? Хто ў асноўным выступае іх ініцыятарам?***

— Перавыдаваць кнігі вельмі важна, асабліва дзіцячыя. Выйшла кніга, напрыклад, пра майго Вухуціка, якога любяць дзеці. У крамах раскупілі тыраж, у бібліятэках потым толькі знойдзеш. Мінула некалькі гадоў — цяжка здабыць кнігу, а трэба ж новае пакаленне маленькіх беларусаў з Вухуцікам пазнаёміць, лісачку Красуню ім прадставіць, Падабайку ў сябры прапанаваць. Выдавецтва перавыпускае тыраж, калі кнігі запатрабаваныя, калі падабаюцца дзецям. І я ўдзячна, што і мае ранейшыя творы зноў выходзяць, што з маімі героямі будуць знаёміцца сённяшнія школьнікі. А ініцыятарам можа выступіць і выдавецтва, і аўтар. Калі кніга добрая — перавыданне будзе.

***— Для вас важна, каб вашы творы перакладаліся на рускую мову? А на іншыя мовы?***

— Я пішу на нашай роднай мове. Лічу сваёй важнай місіяй паказваць, якая прыгожая, багатая, мілагучная наша беларуская мова. Расказваю дзецям, што гэта наша каштоўнасць, наш скарб, наш культурны, нават генетычны код. Зразумела, творчыя сустрэчы і прэзентацыі праводжу на беларускай мове. Ніколі не было такога, каб дзеці не зразумелі, каб адмовіліся слухаць, каб беларуская мова стала перашкодай для цікавасці да кнігі. У маім разуменні ўсе беларусы могуць чытаць мае кнігі ў арыгінале, на роднай мове. Але пераклады кніг — гэта важна, бо тады пашыраецца чытацкая аўдыторыя. Дзве мае кнігі — праваслаўныя апавяданні — былі перакладзены на рускую мову і пабачылі свет у Маскве. Некаторыя мае творы, пакуль не кнігі, а асобныя казкі і апавяданні, выходзілі ў зборніках, газетах, часопісах у перакладзе на казахскую, таджыкскую, уйгурскую, кітайскую, англійскую мовы. Бачыць свае творы ў перакладзе вельмі прыемна і важна. Хочацца мець пераклады, прадставіць маіх герояў дзецям іншых краін.

***— Ці задавальняе мастацкае афармленне вашых кніг?***

— Гэта маё асобнае пісьменніцкае шчасце! Мне шанцуе на цудоўных мастакоў, якія так прыгожа і казачна ўвасабляюць маіх герояў. Вельмі важна, каб у дзіцячай кнізе былі якасныя, густоўныя малюнкі. Для юных чытачоў кніга часта пачынаецца з вокладкі і ілюстрацый, якія прываблівають узяць кнігу ў рукі, пазнаёміцца з ёй. Мае кнігі афармлялі розныя мастакі, працавалі яны ў розных стылях, але ўсе кнігі прыгожыя. І галоўнае — падабаюцца дзецям. А яны заўважаюць усё! Звяртаюць увагу на самі малюнкі, на колеравую гаму, на стыль, кампазіцыю, бачаць кожную драбніцу. Асобна адзначаюць шрыфт — радуюцца буйным літарам, якія добра чытаць. Яшчэ я вельмі цаню, калі мы з мастаком цесна супрацоўнічаем, калі ў мяне пытаюцца пра пажаданні, дасылаюць спачатку паглядзець эскізы. Час стварэння малюнкаў, наша пастаяннае абмеркаванне, сумесныя ідэі — гэта асаблівы перыяд працы над кнігай. Мне ён вельмі падабаецца! Бачыш, як тваё героі і апісаныя падзеі ажываюць. Я шчыра ўдзячна кожнаму мастаку, хто маляваў ілюстрацыі да маіх кніг, за наша супрацоўніцтва.

***— Вы — часты ўдзельнік розных імпрэз, кніжных фестываляў... Не шкадуеце на гэта час, які адрываецца ад творчага карпення за пісьмовым сталом?***

— Сустрэчы з юнымі чытачамі, іх бацькамі, настаўнікамі, бібліятэкарамі — гэта радасць, пісьменніцкае шчасце і крыніца натхнення. Кожнае цудоўнае кніжнае свята пакідае ў сэрцы цёплыя ўспаміны, выклікае прыемныя перажыванні. Іх, гэтыя эмоцыі і самі святы, я апісваю і ў кнігах. На старонках чытачы знаёмяцца з героямі, чытаюць пра сустрэчы, а потым прыходзяць на іх у рэальнасці. Так казка ажывае, да Кніжнай Феі можна завітаць! На свае вочы пабачыць Вухуціка, лісачку Красуню, Падабайку ды іншых герояў. Так што сустрэчы, імпрэзы, фестывалі любім і я, і мае чытачы.

***— А ўвогуле што значаць для вас зносіны з чытачом? Наколькі важнай для вас падаецца зваротная сувязь?***

— Бачыць, чуць сваіх чытачоў, атрымліваць ад іх у сацсетках водгукі — для мяне не проста частка працы пісьменніка, а частка жыцця. Я часта і з вялікім задавальненнем сустракаюся з тымі, каму са старонак кніг расказваю казачныя гісторыі. Убачыць вочы чытачоў, паслухаць аб іх уражаннях, даведацца, пра каго і пра што яны хацелі б пачытаць у казках Кніжнай Феі, надзвычай каштоўна і важна. Шчыра радуюся кожнаму новаму свайму сябру-чытачу, які прыціскае да сябе кнігу з аўтографам, а вочы дзіцяці праменяцца зацікаўленасцю, прыемным чаканнем сустрэчы з упадабаным героем, які стане добрым сябрам. Адчуваю неверагоднае пісьменніцкае шчасце, калі зноў і зноў на сустрэчы па кожную новую кнігу прыходзяць пастаянныя чытачы. Бачыш, як яны растуць, разумееш, як хутка гэта адбываецца... І тут ужо настолькі хочацца затрымаць іх у сваім казачным свеце як мага даўжэй, дарыць ім свае новыя гісторыі, што часам разам з тым, як растуць мае чытачы, пішуцца і кнігі не толькі для пачатковых класаў, але і для сярэдняй, нават старшай школы.

***— Калі б у вас была магчымасць адкрыць уласнае кніжнае выдавецтва, то як, у якім фармаце, якім афармленні выдавалі б кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой?***

— Якім было б выдавецтва Кніжнай Феі? У ім усё было б казачным! Там бы працавалі чараўнікі і чараўніцы, якія выпускаюць самыя добрыя, светлыя, цікавыя, вясёлыя кнігі. Вось расказваю пра чараўнікоў-выдаўцоў і нават уяўляю іх у розных дзівосных строях, каб адпавядалі казачнаму выдавецтву. Рыхтуецца, напрыклад, кніга пра Зачараванае балота — на стале рэдактара стаіць букет лотаці, побач на сцяне вісіць пано з моху і рагозу, а ў абедзенны перапынак у рэдакцыі п'юць гарбату з водной мяты і частуюцца журавінавымі цукатамі. Атмасферна!

Я б хацела, каб мае кнігі былі ў самых розных фарматах. Многія я ўжо прыдумала і разам з выдавецтвам «Звязда» ажыццявіла, застаецца працягваць справу. Гэта і надалей былі б друкаваныя кнігі з мноствам цудоўных малюнкаў. Па-ранейшаму выходзілі б мае кнігі-квэсты, кнігі-перакруткі, кнігі-гаджэты, кнігі-гульні, кнігі-падарожжы. Хацелася б дадаць у выданні мультыкаў, дапоўненай рэальнасці... Усё згаданае ўжо апрабавана, трэба прыдумаць нешта незвычайнае. Хочацца выдаць чароўную кнігу-галаграму! Разгарнуў старонкі, кніга засвяцілася, і над ёй залуналі аб'ёмныя героі, паўсталі апісаныя падзеі, персанажы загаварылі... А пакуль выдаўцы-чараўнікі будуць ажыццяўляць выданне такой кнігі, прапаноўваць чытачам аўдыяказкі і электронныя выданні з малюнкамі.

***— Чаго, на ваш суб'ектыўны погляд, не хапае ў справе прапаганды айчыннай дзіцячай кнігі? Стварыць бы асобную індустрыю дзіцячай кнігі, якая будзе выпускаць і праводзіць выданні ў жыццё, забяспечыўшы кнізе падтрымку.***

— Хочацца часцей бачыць рэкламу на тэлебачанні. Было б цудоўна па кнігах ствараць мультфільмы, здымаць казкі, выкарыстоўваць сюжэты і цікавых персанажаў у дзіцячых праграмах, любавацца банерамі з кнігамі на вуліцах, чытаць пра новыя выданні на яркіх лістоўках у вагонах метро. Буктрэйлеры да дзіцячых кніг запускаць на розных экранах, у інтэрнэце, перад праглядам дзіцячага сеанса ў кіно. А яшчэ персанажам беларускіх казак добра было б з'явіцца на дзіцячым адзенні, заплечніках, пеналах...

Хацелася б больш добрай рэкламы, грунтоўнай раскруткі. Менавіта на дзіцячую літаратуру трэба выкарыстоўваць максімум рэсурсаў, рабіць сур'ёзныя ўкладанні, бо гэта важныя інвестыцыі ў будучыню нацыі. Любоў і цікавасць да кнігі і чытання зараджаецца ў дзяцінстве і застаецца на ўсё жыццё. Падмурак чытацкай самастойнасці, закладзены ў маленстве, будзе трымаць адносіны з кнігай на працягу жыцця. Стане кніга добрым сябрам — пастаянная яе прысутнасць будзе неабходна чалавеку. Яшчэ хочацца, каб беларусы чыталі айчыннае, выбіралі кнігі на роднай мове, адкрывалі для сябе ў беларускай літаратуры імёны сучасных творцаў.

***— Ведаю, што вы не так даўно пабывалі на адметнай кніжнай выстаўцы ў Расіі... Чаму можна павучыцца ў расійскіх прапагандыстаў дзіцячай кнігі, дзіцячага чытання?***

— У цэлым, формы і метады працы падобныя. Мы пабывалі ў бібліятэках Ніжняга Ноўгарада, пабачылі іх вялікія плошчы, сучаснае тэхнічнае абсталяванне, новыя адукацыйныя і забаўляльныя пляцоўкі з цікавым інтэрактывам. Штодня ў бібліятэках праходзіць нешта цікавае, чытачоў запрашаюць на мерапрыемствы, ладзяць майстар-класы, праводзяць заняткі. Прыгожа, творча, цікава.

Маючы цесныя стасункі з дарагімі майму пісьменніцкаму сэрцу беларускімі бібліятэкамі, магу сказаць, што і нашы бібліятэкары руплівыя, ствараюць, працуюць для чытачоў. І я выказваю ім шчырую падзяку за працу, рада быць разам, у адной камандзе, якая адкрывае для юных чытачоў дзівосны свет Кнігі.

Мы з Вухуцікам і лісачкай Красуняй таксама правялі некалькі сустрэч з чытачамі бібліятэкі Ніжняга Ноўгарада і заўсёды пачыналі гаварыць на роднай мове. Цікава было нашым гасцям, мы нават вывучылі з імі некаторыя словы па-беларуску. І ўрыўкі з казак ім вельмі спадабалася слухаць у арыгінале.

Выснова адна: дзеці цікавяцца кнігамі, цягнуцца да чытання, таму мы — пісьменнікі, мастакі, кнігавыдаўцы, бібліятэкары, настаўнікі, бацькі — павінны адной дружнай камандай ствараць добрыя цікавыя кнігі і прадстаўляць іх хлопчыкам і дзяўчынкам. Мы гэта ўмеем і робім. Дзякуй! Працягваем працаваць на карысць юных чытачоў.

**Гутарыў Кастусь ЛЕШНІЦА.**




# Пра душу і (не)штучны інтэлект,

## альбо Чым кранае анімацыйнае кіно?

**Магілёў — анімацыйная сталіца Беларусі, прынамсі, на тры верасnёўскія дні. І так павялося з 1998 года. Пры тым што першы фестываль «Анімаёўка» адбыўся ў Мінску, але амаль адразу яго перанеслі ў Магілёў — так і пайшло далей. Спачатку асноўным клопатам фестывалю быў узровень айчыннай анімацыі, але яна разглядалася ў міжнародным кантэксце, таму колькасць удзельнікаў з-за мяжы з кожным годам павялічвалася. Сёлета да ўдзелу ў XXVII Міжнародным фестывалі «Анімаёўка-2024» былі адабраны творы з 47 краін свету.**

Геаграфія вельмі шырокая, упершыню да ўдзелу ў фэсце далучыліся кінематаграфісты В'етнама і астраўной дзяржавы Трынідат і Табага. Гледачам на працягу трох дзён — з 25 да 27 верасня — прапанавалі да прагляду 317 фільмаў. 248 з іх удзельнічалі ў асноўнай конкурснай праграме, 69 — у конкурсе дзіцячай анімацыйнай творчасці. У экспертную камісію ад Беларусі сёлета ўвайшла Алена Турава, рэжысёр анімацыйнага і ігравога кіно, мастацкі кіраўнік студыі маладзёжнага кіно Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», разам з ёй працавалі рэжысёр-аніматар з Казахстана Дзільжат Рахматулін пад старшынствам кінакрытыка і гісторыка анімацыі з Расійскай Федэрацыі Паўла Шведава.

Тое, што адгледзелі эксперты, ацэньвала журы, у асноўным конкурсе яго ўзначаліла Ірына Тарасава, беларускі аніматар, аўтар стужкі «263 ночы», якая атрымала Гран-пры фестывалю два гады таму. Разам з ёй запрасілі «судзіць» творы канкурсантаў рэжысёраў-аніматараў Сі Чэнь (КНР), Паўла Пацехіна і Настассю Жакуліну з Расійскай Федэрацыі.

У асноўным конкурсе сёлета Беларусь прадставіла чатыры творы 2024 года. Прычым адзін з іх — «Леанід Шварцман. Казка пра хлопчыка і стары горад» маладога рэжысёра Кацярыны Шарамет — у складанай форме, дзе спалучаецца дакументальны аповед з анімацыяй, нагадвае пра знакамітага мастака-мультыплікатара Леаніда Шварцмана, які нарадзіўся ў даваенным Мінску. Менавіта ён прыдумаў Чабурашку, які скарыў шмат дзіцячых сэрцаў — надта прывабны быў гэты персанаж не толькі для малых, але і для дарослых, західу ў душу. Не дзіва, бо «аніма» — гэта якраз душа, яна ляжыць у аснове гэтага цудоўнага віду кінамастацтва. Таму і цяпер беларускія мультыплікатары імкнуцца кранаць душу праз нечаканыя для анімацыі тэмы. Але ж чаму нечаканыя — у анімацыі вялікія магчымасці ўздзеяння на чалавека.

На гэта разлічаны выпуск нацыянальнага праекта, анімацыйна-дакументальнага альманаха «Мемарыяльныя комплексы Беларусі», дзве часткі якога — «Ала» Наталлі Касцючэнка і «Прарыў» Таццяны Кубліцкай — таксама ў асноўным конкурсе фестывалю. «Ала» распавядае пра помнік у Светлагорскім раёне, што ўшаноўвае памяць пра 1758 мірных жыхароў, якія былі спалены і расстраляны ў 1944 годзе. Комплекс «Прарыў» знаходзіцца ва Ушацкім раёне і нагадвае пра партызанскую гісторыю, калі 16 брыгад здолелі выйсці з акружэння і ўратаваць больш за 15 000 мірных жыхароў. І яшчэ адна работа ў асноўным конкурсе ад Беларусі — «Пастка, створаная чалавекам» рэжысёра Дзмітрыя Шарандзікава. Глядзець і думаць ёсць пра што. У тым ліку пра будучыню беларускай анімацыі: у конкурсную праграму для аўтараў да 17 гадоў ад Беларусі прайшла 21 стужка. Гэта важна, таму што сёлета пераможцы «Анімаёўкі» атрымліваюць значны «бонус» — дадатковыя балы пры паступленні ў Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры. Тут журы ўзначаліў рэжысёр кінастудыі «Саюзмультфільм» Сяргей Струсоўскі з Расіі.

Але яшчэ да афіцыйнага адкрыцця фестывалю ў вялікай зале кінатэатра «Радзіма» ў Магілёве пачала працаваць выстаўка ўдзельнікаў конкурсу дзіцячага выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Конкурс ладзіцца дзеля падтрымкі творчай іскрынкі беларускіх дзяцей. Тут ёсць сваё журы, якое павінна было вынесці меркаванне пра 132 творы — яны аздобілі кінатэатры, дзе дэманстраваліся стужкі, і праз сваю душу нібыта «ўцягнулі» гледача ў знаёмства з кінапраграмай.

Паколькі анімацыя — асаблівая форма размовы з чалавекам, пра яго душу, з мэтай яе крануць, таму яна для шырокіх колаў гледачоў. Але адмыслова для дарослых, з пазнакай «16+» была задумана праграма «Бяссонніца» ў кінатэатры «Радзіма».

Частка сустрэч былі настолькі адмысловыя, што аб'ядналі дарослых і дзяцей агульным захапленнем. Напрыклад, першыя гледачы знакамітага мульціка «Маша і Мядзведзь» ужо выраслі, але наўрад ці забудуць гарэзлівую дзяўчынку, што «наводзіла шолаху» ў лесе і знаходзіла выйсце з любой сітуацыі. Сёлета і малыя, якія толькі знаёмяцца з Машай, і дарослыя, якія яна таксама ўражвае, з задавальненнем сустрэліся з актрысай Юліяй Зунікавай, галасам якой гаворыць дзяўчынка, і гукарэжысёрам карціны Барысам Кутнёвічам. Майстар-класы і творчыя сустрэчы — гэта яшчэ адна важная частка праграмы, якая дазваляе лепш зразумець асаблівасць гэтага мастацтва. Напрыклад, да размовы з беларускім рэжысёрам Наталляй Касцючэнка прымеркавалі паказ анімацыйных стужак «Беларусьфільма», створаных да 100-годдзя айчыннага кіно. Але «хіт» праграмы майстар-класаў — пра тое, як штучны інтэлект дапамагае ў стварэнні анімацыйных фільмаў. Сучасна, перспектыўна, захапляльна. Але, напэўна, застануцца сярод прыхільнікаў анімацыі тыя, хто ўпэўнены, што гэта найперш талент чалавека. Пра што можна будзе ўпэўніцца праз «Рэха Анімаёўкі», калі стужкі будуць дэманстравацца ў кінатэатрах Беларусі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

### Асноўныя прызы «Анімаёўкі»

**Гран-пры** фестывалю (намінацыя «Найлепшы анімацыйны фільм») прысуджаны стужцы «Ноч у зоне адпачынку» японскага рэжысёра Сакі Мурамота.

**«Найлепшым рэжысёрам анімацыйнага фільма»** прызналі Эрыка Лі з Кітая, аўтара стужкі «Вецер працягваецца».

**«Найлепшы эксперыментальны анімацыйны фільм»** — «Бяссонныя ночы» (рэжысёр Яніс Осэль з Францыі).

Упершыню ўручалі прыз у намінацыі **«Найлепшы анімацыйны серыял»** — ён паедзе ў Вялікабрытанію дзякуючы стужцы «Заўсёды здзіўляльныя «шоу прыроды» (аўтар Мервэ Чырысаглу).

На «Анімаёўцы» шмат прызоў. Але для нас цікава, што **найлепшы беларускі фільм** — «Ала» Наталлі Касцючэнка.

А **«Найлепшым анімацыйным фільмам, створаным дзецьмі»** стаў «Святло свету» Елісея Грузда з Беларусі. У гэтай узроставай катэгорыі ў нас сёлета шмат узнагарод.

Кінакрокі

# Бязмежная палітра каштоўнасцяў жыцця

**У панядзелак, 30 верасня, у Смаленску стартуе VIII Міжнародны фестываль дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія.DOC». А 3 і 4 кастрычніка працяг яго чакаем у Мінску. Як і штогод, сёлета яго наведвальнікам прапануюць не толькі прагляд цікавых дакументальных кінастужак, але і ўдзел у абмеркаванні шэрагу актуальных тэм у асяроддзі экспертаў. У кароткай праграме фестывалю будуць прадстаўлены 32 фільмы-фіналісты з Беларусі, Расіі, краін СНД і далёкага замежжа. З улікам таго, што кінафорум праводзіцца пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД, усе адкрытыя паказы дакументальных кінастужак і дыскусіі бясплатныя для наведвальнікаў.**

Напярэдадні старту фестывалю ў яго адрас ужо пачалі паступаць першыя віншаванні. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава адзначыла ў сваім звароце да ўдзельнікаў і гасцей «Еўразіі.DOC», што гэты форум ужо паспеў зарэкамендаваць сябе як значная культурная, медыйная падзея ў календары беларускай сталіцы і дазваляе пазнаёміцца з найлепшымі дакументальнымі работамі еўразійскай і сусветнай прасторы: «...Сёння на стваральніках дакументальнага кіно ляжыць вялікая адказнасць за аб'ектыўную аўтарскую перадачу «нерва часу», сутнасці сусветных і рэгіянальных канфліктаў, сутыкнення высокіх гуманістычных ідэалаў і традыцыйнай культуры народаў Еўразіі з так званымі новымі каштоўнасцямі, а на самай справе — з «шырспажывам» глабалізму, бескультур'ем адмены шэдэўраў мастацтва і іх аўтараў, забыццём праўдзівай гісторыі і маральнасці. Адсюль і высокі запыт беларускай аўдыторыі на праўду і справядлівасць у дакументальных стужках»...

Адкрыецца кінафорум у Смаленску ў панядзелак фільмам «Югорскія навелы» (Расія, 2023 г.) рэжысёра Аляксандра Авілава. Дарэчы, гэтую кінастужку змогуць убачыць і ў Беларусі 3 кастрычніка ў Доме Масквы. Фільм знаёміць гледачоў з гісторыямі людзей, якія не імкнуцца ў вялікія гарады, а свядома выбралі для жыцця радавыя ўгоддзі і паселішчы югорскай зямлі. У навелах «Шлях да вытокаў», «Свая зямля», «Прыняць выклік», «Дом без сцен» і «Помніць старыя казкі» паказаны героі розных прафесій (захавальніца старажытных хантыйскіх рэцэптаў, фельчар санітарнай авіяцыі, сучасная паляўнічая, аленявод-філосаф і настаўніца музыкі), але аб'яднаны яны адным жаданнем — захоўваць нацыянальную культуру, звычаі і побыт продкаў і перадаваць іх сваім дзецям, наступным пакаленням. Рэжысёр кінафільма правёў з кожным з гэтых людзей больш за тыдзень, фіксуючы іх працоўныя будні. Адчуць гэтую атмасферу цяпер будзе магчымасць і ў шматлікіх гледачоў. Яшчэ ў рамках форуму пройдзе Маладзёжны конкурс «Еўразія.DOC: 4 хвіліны». Творчае спаборніцтва дазваляе заявіць пра сябе і прэзентаваць свае ідэі маладым рэжысёрам-дакументалістам. У гэтым годзе з 57 заявак у шорт-ліст адабралі восем кароткаметражак, чатыры з якіх ад беларускіх аўтараў.





Пасля 1 і 2 кастрычніка ў Смаленску прадэманструюць яшчэ шэраг дакументальных кінастужак з розных краін і самай разнастайнай тэматыкі. Напрыклад, што датычыцца Беларусі, то сёлета ад нашай краіны ў праграму «Еўразіі.DOC» трапілі фільмы «Сусвет Івана Міско» Яўгена Сяцько, «Гаспар не выйшаў на сувязь» Анатоля Занковіча, якія пакажуць расійскай аўдыторыі. А 3 і 4 кастрычніка ў Мінску мы зможам трапіць на паказы кінаработ «Яна — вайна» Паліны Лушчык, «Горад пад намі» Ганны Літаш, «Мінск 1944. Вызваленне» Аксаны Лашкевіч і «Шталаг 352. Без права на забыццё» Аляксандра Шурмілёва. Знайсці праграму і час сеансаў можна на афіцыйным сайце кінафестывалю.

А вось калі звярнуцца да праектаў, заяўленых у праграме сёлета ад іншых краін, то па анонсах звяртае на сябе ўвагу шэраг кінастужак. Стужка «Аул стратэгічнага прызначэння» (Казахстан, 2023 г., рэж. Болатхан Нусімбекаў) пераносіць гледача на мяжу Казахстана з Кітаем і пазнаёміць з умовамі жыцця тых, хто не жадае адракацца ад роднай зямлі. Фільм «Мама» (Кыргызстан, 2022 г., рэж. Айдана Асан кызы) — гісторыя пра жанчыну, якая працуе медсястрой у дзіцячай бальніцы, а па-за працай прысвячае сябе выхаванню васьмярых дзяцей... Вядома, у некаторых фільмах цэнтральнай тэмай з'яўляецца паказ вайны, у розныя часы і ў розных гарадах такая рэчаіснасць мае сваіх герояў, антыгерояў і наступствы. Да такога зместу кінаработ можна аднесці «Забыць латышскага снайпера» (Латвія, 2023 г., рэж. Андрэй Якаўлеў), «Браты» (Расія, 2023 г., рэж. Айгуль Ярбулава), «На фронт» (Расія, 2024 г., рэж. Ульяна Герасімава).

Арганізатарам фестывалю з беларускага боку з'яўляецца Беларускі саюз журналістаў. Яго мерапрыемствы праводзяцца пры падтрымцы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінгарвыканкама, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры Беларусі. Акрамя кінапаказаў, у рамках фестывалю пройдуць таксама майстар-класы, сустрэчы з аўтарамі і круглыя сталы. Так, непасрэдна ў беларускай сталіцы плануецца абмеркаванне такіх тэм, як «Гарызонты новага свету. Стваральныя прынцыпы новай светабудовы» і «Памятныя даты Вялікай Айчыннай вайны. 80 гадоў вызвалення Беларусі». Мінгарвыканкам планує выкарыстоўваць мерапрыемствы кінафоруму ў якасці адкрытых дыскусійных пляцовак па тэматыцы Года якасці, супрацьдзеяння інфармацыйным укідам, 80-годдзя вызвалення Беларусі, перспектывам нашай краіны ў буйных рэгіянальных інтэграцыйных праектах (ШАС, АДКБ, СНД і іншых). Таму сачыце за навінамі і плануйце сваю культурную праграму на пачатак кастрычніка.

**Алена ДРАПКО.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-60-11.

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (процент готовности 6 %: фундамент – блоки железобетонные; площадь застройки 80 кв. м,), баня (фундамент – бетон, стены – бревно, кровля – лист асб/ц, полы – доска; наружная площадь 19 кв. м), уборная (стены – доска, кровля – лист асб/ц, полы – дерев., площадь застройки 1 кв. м, и земельный участок с кадастровым № 240100000003003120 площадью 0,1490 га в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. Заречный, 11. Ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий связи и радиофикации, 0,0115 га.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **34829,09** (8515,69 /26313,40) бел. руб. **Задаток: 3482,90** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 24,45 %

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 14.10.2024 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 30.09.2024 до 17.30 11.10.2024 в рабочие дни по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с:** BY14AKBB36423020002802000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300200386, код операции: 40901 (перечисление гарантийного взноса), получатель платежа: Витебский горисполком. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 07.03.2024, 02.05.2024, 29.08.2024, информационное сообщение – газета «Витьбичи» 12.03.2024, 02.05.2024, 29.08.2024.
**Условия для победителя аукциона либо единственного участника**: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в течение 2 месяцев со дня утверждения протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома), обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельных участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией

**Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь, негосударственных юридических лиц Республики Беларусь), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность; представителем гражданина РБ – доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица без нотариального засвидетельствования, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр.лица, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 161/С-20596 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома) площадью 46,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Волчинский с/с, д. Волчин, ул. Ленина, 52, на земельном участке с кадастровым номером 124081701601000285 площадью 0,2049 га, составные части и принадлежности: терраса, сарай с погребом, гараж, два сарая, навес, уборная

| Начальная цена, руб. | 31 963,46 | Размер задатка, руб. | 3 196,35 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Беловежский», Брестская обл., Каменецкий р-н, аг. Беловежский, ул. Ленина, 2, тел. 80163172881. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 29 октября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 28 октября 2024 г. до 17.00.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения) площадью 2754,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025 площадью 0,2478 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 59 800,00 | Размер задатка, руб. | 5 980,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «СКО «Брестагроздравница», Брестская обл., Брестский р-н, район п. Берестье, тел./ф 80162 94 13 34. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 15 октября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 14 октября 2024 г. до 17.00.**

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ГОЛХУ «Осиповичский опытный лесхоз», 213765, Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 12, тел. +375 2235-51805 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, бывшие в употреблении, по адресу: Могилевская обл. г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 12**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
